№ 48 (646) 23 снежня 2009 www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Навумаў уцякае ў Маскву

Старонка 6


оставление безвозмездной (спонсор
форм собственности, расположенных
финансирования расходов по указанн
н. рублей.
едоставлении безвозмездной (спонсор
П "Капитальное строительство город
рмами Указа Президента Республ
г. № 300 "О предоставлении и
сорской) помощи".
работы по данному вопросу

## Скіньцеся па 17 тысяч даляраў

Старонка 6




## Кніга года: «Нацыянальнасць — Беларус»

Старонка 10


### У НУМАРЫ

**За BYR слабейшы толькі быр**

За год рубель саслабеў у адносінах да 82 з 83 валют, на якія Нацбанк усталёўвае курсы. **Старонка 5.**

**Каляндар-2010**

Што чакае ў наступным годзе? **Старонка 8.**

**«Ляпісы» і «Морсы»**

Рэйтынгі продажаў па выніках года. **Старонка 11.**

**Ягор Гайдар: Заканчэнне эпохі**

Піша Віталь Тарас. **Старонка 7.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Асобы года

Аляксандр Рыбак, Павел Латушка, Усэйн Болт, Вікторыя Азаранка... **Старонка 3.**

















**Найлепшы падарунак на Новы год** — першы беларускі настольны каляндар-даведнік «Грунвальд». Пытайцеся ў кнігарнях, на кніжных кірмашах і ў незалежных распаўсюднікаў.

## Беларускі дэлегат спаў на Капенгагенскай канферэнцыі па клімаце

Саміт ААН па пытаннях змены клімату цягам двух тыдняў быў у першых радках інфармацыйных агенцтваў усяго свету. Але ўдзел беларускай афіцыйнай дэлегацыі адзначыўся толькі вось такім фота.

Удзельнік беларускай афіцыйнай дэлегацыі Аляксандр Грабянькоў пракаментаваў фотаздымак так: «Там дзясятак здымкаў апублікаваны, як іншыя дэлегацыі спяць. Я асабіста не спаў тры дні практычна... Без душу, без нармальнай ежы, без усяго. І як толькі з'яўляўся нейкі перапынак, усе ўпавалку. Гэта проста быў нейкі бамжатнік, вы ведаеце...»

Цяжкая ты, праца дыпламата.

**Сяргей Гезгала**




**Дэлегат спіць у часе перапынку пленарнага пасяджэння Капенгагенскай канферэнцыі, што зацягнулася 19 снежня на цэлую ноч.**

# Шчаслівыя міратворцы



Калядны зварот духоўнага лідэра беларусаў замежжа, апостальскага візітатара беларусаў-каталікоў замежжа айца **Аляксандра Надсана**.

Неяк не вельмі даўно з маёй знаёмай здарыўся цікавы выпадак.Вось што яна расказала мне пра яго. Ехала яна лонданскім метро — са сваёй дачушкай, якой яшчэ не было аднаго годзіка. Раптам у вагон убег малады чалавек, які пачаў паводзіць сябе даволі агрэсіўна. Усе пасажыры насцярожыліся, але ніводзін з іх не асмеліўся зрабіць яму заўвагу, баючыся ягонай рэакцыі. Толькі дачушка маёй знаёмай заставалася бесклапотнай, і, калі малады чалавек падышоў бліжэй, яна ўсміхнулася яму.

Малады чалавек, уражаны, затрымаўся, пасля на ягоным твары з'явілася таксама ўсмешка, а з ёй знікла ўся ягоная ранейшая агрэсіўнасць. Усе ў вагоне ўздыхнулі з палёгкай. Відаць, усмешка нявіннага дзіцяці кранула сэрца маладога чалавека. Можна сказаць, што дзіцятка, не ўсведамляючы гэтага, учыніла першую ў сваім жыцці міратворчую акцыю...

Гэтае здарэнне прыгадалася мне якраз цяпер, калі мы адзначаем успамін прыйсця на свет іншага Дзіцяці, пра якога святы Павал пасля скажа: «Калі прыйшла поўня часу, Бог паслаў Сына свайго адзінароднага, які нарадзіўся ад жанчыны, стаў падуладны закону, каб выкупіць тых, што пад законам, каб нам атрымаць усынаўленне» (Гал 4:4-5). Іншымі словамі, мы святкуем нараджэнне ў целе Сына Божага, Госпада, Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста.

І вось цікава: спрадвечны Бог і Творца ўсяго яўляецца людзям не ў сваёй бязмежнай велічы, але як бездапаможнае дзіцятка, якое мае патрэбу ў нашай дапамозе і спагадзе. Ён не жадае, каб мы слепа слухаліся Яго, дрыжучы ў страху перад Ягонай магутнасцю. Ён хоча нашых сэрцаў, бо толькі тады можа настаць «супакой на зямлі людзям добрай волі».

Дык адчынім нашыя сэрцы для нованароджанага Госпада нашага, каб нам стаць разам з Ім саўдзельнікамі працы дзеля супакою на ўсім свеце, памятаючы Ягоныя словы: «Шчаслівыя міратворцы, бо яны будуць звацца сынамі Божымі».

*Айцец Аляксандр Надсан,*
*Лондан, 2009*

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

КАЛЯДНЫ ВЕРШ

Снег ідзе, пакідаючы ў меншасці год.
Прадавачкам два тыдні раскошы:
мандарынкі з шампанскім — і будзе даход,
покі ў нас не закончацца грошы.

Прыляціць Мікалай у калядных санях.
Надаюць аднакласніцы бусек.
У спартзале ялінка ў святочных агнях,
а пад ёй — хто б вы думалі? Трусік.

І запаляцца свечкі, і створаць інтым,
і прыедзе ў паўночным трамваі
прыгажуня-Снягурка, і ганьба ўсім тым,
хто казаў, што яе не бывае!

Не замерзні, глядзі! Ты і сам Дзед-Мароз,
сіні нос для цябе не пытанне,
сівізна ў бараду, а спыніцца — не лёс.
Бачыш зорку? Загадвай жаданне!

Загадай пра сябе, як Другі Прэзідэнт,
каб бацькоў сваіх слухалі дзеткі;
каб каханкі не змерзлі на вуліцы ўшчэнт,
пад футэркам хаваючы кветкі.

Мікалай-канспіратар, стары дысідэнт,
падарункі схаваў у шкарпэткі
і, чытаючы верш за калядны прэзент,
не зваліўся ніхто з табурэткі.

**Снежань 2009**




**Андрэй Хадановіч** (нар. 1973) — паэт, аўтар кніг «Бэрлібры», «Сто лі100ў на tut.by». Старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтра. Зміяніў стэрэатыпы пра беларускую паэзію.

### УДАКЛАДНЕННЕ

У матэрыяле «Каб людзі менш пілі, трэба, каб яны большараблялі» у №47 дапушчана памылка. Герой матэрыялу аказаўся больш маладым. Пісьменнік Леанід Дайнэка нарадзіўся 28 студзеня не 1939, а 1940 г. Дарэчы, з нагоды юбілею сп. Дайнэка чытачоў і сяброў на творчы вечар, які адбудзецца 29 студзеня 2010 году а 18-й гадзіне ў Чырвоным касцёле.

### КАЛЯДНАЯ АФІША

**Ave Maria**

**Ад 25 да 27 снежня ў Чырвоным касцёле** сталіцы ладзіцца фестываль духоўных спеваў «Ave Maria». Бяруць удзел больш за 28 калектываў з усёй краіны, хрысціянскі тэатр «Анёл».

**Навагодні экспрэс**

**Ад 25 снежня да 10 студзеня па Дзіцячай чыгунцы** ў сталіцы будзе курсаваць фірмовы цягнік «Навагодні экспрэс». Бацькам з дзецьмі прапануецца інтэрактыўнае тэатралізаванае падарожжа ў навагоднім утульным «вагончыку» па заснежаным лесе, сустрэчы з казачнымі героямі і, безумоўна, з Дзедам Марозам і Снягуркай. Працягласць падарожжа — 1 гадзіна 10 хвілін. Кошт білета — 10 тысяч рублёў (у тым ліку і для дзяцей).

### СЦІСЛА

**У сераду рэзка пацяплее: да +4°С**

23—24 снежня па краіне чакаецца рэзкая змена надвор'я. Маразы адлягуць. Чакаецца мокры снег, дождж, галалёд на дарогах. Тэмпература паветра днём да плюс 4°С.

**Нацбанк: Разавай дэвальвацыі не будзе**

Разавых змяненняў курсу беларускага рубля ў 2010-м не будзе, запэўніваюць у Нацбанку. Там плануюць на працягу наступнага года падтрымліваць курс рубля да кошыка замежных валют у межах калідора ваганняў +/– 10%.

**Еўра пераацэнены**

Еўра пераацэнены ў дачыненні да іншых валют, і яго далейшае павышэнне ў цане можа пашкодзіць эканомікам еўразоны, заявіла Еўракамісія. Паводле даклада выканаўчага органа ЕС, пераацэнка рэальнага эфектыўнага курсу складае 7—8%.

**Беларусь атрымала ад Сусветнага банка $200 млн**

Гэтая аднатраншавая пазыка выдзяляецца на 16 гадоў і прадугледжвае адтэрміноўку на шэсць гадоў. Падтрымка адрасуецца на дапамогу найбяднейшым слаям насельніцтва і на стымуляванне інвестыцый.

**Рабаўнікі напалі на мікрааўтобус**

20 снежня ў 23.50 ля вёскі Русакова (Слонімшчына) на мікрааўтобус «Форд» напалі пяцёра невядомых у масках і з прадметамі, падобнымі да пісталетаў і абрэзаў. Злачынцы звязалі кіроўцу і восем ягоных пасажыраў, выкралі 1,3 млн рублёў, 21 тыс. даляраў, залатыя вырабы.

**СМ**

# Пара аформіць падпіску

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй падпісчыкам

А.К. з Іўеўскага раёна.
Юрыю Р. з Лідскага раёна.
Сяргею Ц. з Докшыцкага раёна.
Дзмітрыю Г. з Столінскага раёна.
П.К. з Мастоўскага раёна.
Віктару Д. з Капыльскага раёна.
Аляксандру Д. з Карэліцкага раёна.
Алене Дз. З Навагрудскага раёна.
Мікалаю Ш. з Салігорскага раёна.
Л.Ш., Людміле П., Святлане Ш. з Віцебска.
Вользе Ж., Іне С., В.Д., Уладзіміру Я. з Барысаўскага раёна.
Алесю Б., Сяргею В. з Баранавіцкага раёна.
А.Г. з Кіраўскага раёна.
Юрыю Г., Т.В., С.В., Наталлі Б., Г.С., І.С., Галіне Л., С.К. з Гродна.
А.П. з Брэста.

# Асобы года



**Наталля Васілевіч**

палітолаг, рэдактар сайта «Царква». Нарадзілася ў 1982, вучылася ў Беларускім гуманітарным ліцэі, БДУ, Рыжскай бізнэс-школе, Еўрапейскім гуманітарным універсітэце. Прадстаўніца міжнароднай моладзевай праваслаўнай арганізацыі «Сіндэсмас» у Цэнтральнай Еўропе. Дырэктар цэнтра «Экумена».

## Чалавек года — Наталля Васілевіч і іншыя дабрачынцы

Уключыўшы тэлевізар ці прагортваючы навіны ў інтэрнэце, мы часцей за ўсё бачым паведамленні пра тэракты, тэхнагенныя і прыродныя катастрофы, маньякаў і серыйных забойцаў ва ўсіх кутках свету. Лік ахвяраў ідзе на тысячы, і гэта мала каго кранае. Мы сутыкаемся з паўсюднай дэгуманізацыяй чалавека. Ён з інтарэсам будзе назіраць за жарсцямі вакол збіцця Берлусконі, а беды ўласнага суседа не пабачыць.

Тым не менш, застаюцца людзі, здольныя на сапраўдныя ўчынкі. Такія, як сёлета здзейсніла Наталля Васілевіч і ейныя сябры. Прачытаўшы допіс блогеркі Міхалінкі (Інгі Татур) пра праблемы інвалідаў-вазочнікаў, Васілевіч пачала ў інтэрнэце збор сродкаў на новую механічную каляску для жанчыны.

І за год намаганнямі, як правіла, цынічнай інтэрнэт-супольнасці ўдалося сабраць неабходную суму. Гэта рэальны прыклад людскай самаарганізацыі і спачування чалавечай бядзе. Прыклад, як можна зрабіць жыццё лепшым — няхай і для аднаго чалавека. Такія «малыя справы» мацуюць вялікую нацыю.

Дырэктар цэнтра «Экумена», праваслаўная верніца Наталля Васілевіч не першы год дапамагае Кобрынскаму дзіцячаму дому. Таксама дзяўчына адной з першых сярод выпускнікоў БДУ паставіла свой подпіс у абарону адлічанай студэнткі БДУ Таццяны Шапуцкі. Такія ўчынкі выклікаюць павагу.

## Дабрадзей года ў інтэрнэце — Ігар Маханёк

Самая вядомая ў свеце онлайн-праграма для перакладу Google Translate ўзбагацілася беларускай мовай. Гэта пашырае магчымасці выкарыстання мовы ў сённяшнім свеце. Цяпер можна аўтаматычна перакласці з беларускай на яшчэ 50 моваў. Так, сёння гэтым рэсурсам карыстаецца нямнога людзей. Але і Скарынава «Біблія Руска» была даступная не кожнаму.

Ініцыятарам беларусізацыі праграмы быў інжынер кампаніі Google Ігар Маханёк. Ён беларус, які працуе ў Швейцарыі. Вядома, пераклад не ідэальны, але пачатак дадзены. Зараз трэба будзе толькі ўдасканальваць наяўны прадукт. Адзначаючы Маханька, мы адзначаем усіх людзей, якія беларусізуюць інтэрнэт.

У іншых краінах перавод у электронны фармат і развіццё інтэрнэт-прыладаў фінансуюцца з дзяржаўных бюджэтаў. У нас жа гэта таленавітыя людзі робяць самі. Так, Хведар Піскуноў стварыў першы электронны граматыка-парадыгматычны слоўнік беларускай мовы «Парадыгма», а таксама праграму праверкі арфаграфіі «Літара». Сяргей Чарнавокі пераклаў на беларускую мову інтэрфейсы Гугла, інтэрнэтэнцыклапедыі Вікіпедыя, а таксама сацыяльнай сеткі Фэйсбук. Праграміст з Ліды Алег Азароўскі самастойна распрацаваў беларуска-расійска-беларускі перакладчык «Белазар».

Беларусізацыя Інтэрнэта дае будучыню беларускай мове і культуры.



**Ігар Маханёк**

нарадзіўся ў 1985 у Мінску. Скончыў факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. У 2005 і 2006 атрымліваў тытул «Чалавек, які знайшоў усё» за перамогу ў Кубку Яндэкса. Цяпер працуе інжынерам-праграмістам у кампаніі Google ў швейцарскім Цюрыху.

## Спявак года — Аляксандр Рыбак

Ураджэнец Беларусі Аляксандр Рыбак стаў пераможцам песеннага конкурсу «Еўрабачанне». Але выступаў хлопец не за Беларусь, а за далёкую Нарвегію. Поспех Рыбака прымусіў беларусаў задумацца над праблемай нацыянальнай ідэнтычнасці. А песня «Казка» стала сапраўдным хітом, які грае на мабілах. Рыбак пражыў амаль усё свядомае жыццё ў Нарвегіі, але захаваў выдатнае беларускае вымаўленне. Ягонай «Купалінцы» падпяваў нават Лукашэнка.

**Аляксандр Рыбак**

нарадзіўся ў 1986 у Мінску. У 1990 разам з бацькамі пераехаў у Нарвегію. Скончыў музычнае вучылішча, цяпер навучаецца ў кансерваторыі Осла. З песняй «Fairytale» выйграў сёлетняе «Еўрабачанне» ў Маскве.

## Вязень года — Мікалай Аўтуховіч

Ад лютага ў следчым ізалятары на Валадарцы знаходзіцца ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч. Ягоны арышт нагадваў сцэну з баевіка. Аўтуховічу ўвесь час мянялі абвінавачванні, ніхто не разумеў, за што ж яго арыштавалі. Толькі праз паўгода ваўкавысца абвінавацілі ў падрыхтоўцы тэракта супраць старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра Саўчанкі і намесніка міністра па падатках і зборах Васіля Камянка. Сам Аўтуховіч і ягоны таварыш Уладзімір Асіпенка лічаць, што іх пераследуюць за антыкарупцыйную дзейнасць. У зняволенні Аўтуховіч правёў трохмесячную галадоўку.




**Ва урадзе з'явіўся першы беларускамоўны міністр — Павал Латушка. На фота: ліпень, на З'ездзе беларусаў свету.**

## Заляцанне года — Павел Латушка

Прызначэнне на пасаду міністра культуры Паўла Лаўтушкі стала лагічным працягам абвешчанай уладамі палітыкі лібералізацыі. Малады, еўрапейскі, беларускамоўны міністр. Але костку нацыянал-дэмакратам кінулі зноў у сферы культуры. З'яўленне беларускамоўнага міністра транспарту ці абароны мела б куды большы рэзананс.

Працяг на старонцы 4.

**Павел Латушка**

нарадзіўся ў 1973 у Мінску. Вучыўся на гістфаку Белдзяржуніверсітэта, а закончыў юрфакультэт БДУ (1995). Таксама ў 1996 завочна скончыў Лінгвістычны ўніверсітэт. Займаў розныя пасады ў структуры Міністэрства замежных справаў. У 2000–2002 — прэс-сакратар МЗС. З 2002 да 2008 быў паслом Беларусі ў Польшчы і самым маладым беларускім паслом. Ад чэрвеня 2009 — міністр культуры.

## Здымкі года




**Коля Лукашэнка быў у цэнтры ўвагі СМІ. Чэрвень — вокладка часопіса «Magazyn Polski».**




**Партыю Беларуская хрысціянская дэмакратыя ўлады так і не зарэгістравалі. Люты — Павал Севярынец у часе ўстаноўчага з'езда партыі.**




**Верасень. Партыю БНФ узначаліў 33-гадовы Аляксей Янукевіч.**



**Люты. Працэс пайшоў. Высокі прадстаўнік Еўрасаюза Хаўер Салана ўпершыню наведаў Мінск. Год адзначыўся інтэнсіфікацыяй кантактаў між Беларуссю і ЕС.**

Працяг са старонкі 3.

# Асобы года

## Спартсмен года — Вікторыя Азаранка

Светлавалосая дваццацігадовая дзяўчына з выглядам мадэлькі сёлета стала самай пазнавальнай нашай



**Тэнісістка Вікторыя Азаранка стала новым сімвалам поспеху. Чэрвень — яна знялася для мужчынскага часопіса FHM. Французскага.**

**Вікторыя Азаранка**

нарадзілася ў 1989 у Мінску. Тэнісістка. Рост — 180 см. Вага — 60 кг. За час спартыўнай кар'еры зарабіла 3 мільёны 510 тысяч 297 даляраў. Пераможца турніраў у Брысбене, Мемфісе і Маямі. Жыве ў Скотсдэйле, штат Арызона (ЗША).

суайчынніцай у свеце. Вікторыя Азаранка выйграла тры турніры з серыі ВТА і цвёрда ўвайшла ў дзясятку найлепшых тэнісістак свету. Свой характар Азаранка прадэманстравала на выніковым турніры ў Катары, калі гуляла з траўмай, праз боль і слёзы, але ўпарта адмаўлялася здавацца.

## Сябар года — Сільвіё Берлусконі

Сёлета Лукашэнка сустракаўся не толькі з азіяцкімі, паўднёваамерыканскімі і афрыканскімі і расійскімі лідэрамі, але і з еўрапейскімі. Аж двойчы ён спаткаўся з харызматычным італьянскім прэм'ерам Сільвіё Берлусконі — у Рыме і ў Мінску. Падчас прыезду ў Беларусь Берлусконі заляпіў у размове з Лукашэнкам: «Ваш народ вас любіць, пра што сведчаць вынікі выбараў». Цягам года Берлусконі трапляў і ў іншыя скандалы: то з дзяўчатамі на віле зловяць, то з жонкай развядзецца, то твар яму разаб'юць.

## Параноя года — Віктар Марціновіч

Раман журналіста Віктара Марціновіча «Параноя» нечакана быў забаронены для продажу ў Беларусі. Наўрад ці гэта адмоўна адбілася на камерцыйным поспеху: прачытаць «Параною», што трапіла ў «чорны спіс», захацелі многія. А сам раман Марціновіча пра Мінск, каханне і жыццё ва ўмовах дыктатуры.

## Шафёр года — Андрэй Арамнаў

Часта нечуваныя поспехі кружаць галаву маладым людзям. Так сталася з алімпійскім чэмпіёнам па цяжкай атлетыцы Андрэем Арамнавым. Міліцыя двойчы затрымлівала Арамнава п'яным за рулём аўто. Справу перадалі ў суд. Атлета аштрафавалі, пазбавілі правоў і прэзідэнцкай стыпендыі. На судзе Арамнаў паабяцаў: «Я болей так не буду». Можа, паверым?

## Ахвярнасць года — Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч

Палкоўнікі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч ахвяравалі сабой, каб выратаваць жыцці гледачоў авіяшоу ў польскім Радаме. Беларускія лётчыкі, адчуўшы, што самалёт падае, вырашылі не катапультавацца, а адляцець далей ад людзей. Уратавацца мужчыны не змаглі. Вечная слава героям!

## Кароль года — Сяргей Міхалок

«Рок-каронy» сёлета заслужана атрымаў «Ляпіс Трубяцкой». На фоне Сяргея Міхалка і кампаніі іншыя беларускія музыкі ў 2009 годзе выглядалі бляклa. Чаго варты адзін канцэрт у Палацы спорту, дзе ўпершыню ў Беларусі быў выкананы забаронены хіт Belarus Freedom.

## Сюрпрызмэйкер года — Пётр Пракаповіч

У 2009 год беларусы ўвайшлі з дэвальвацыяй у 20%. А бажыўся ж старшыня Нацбанка Пётр Пракаповіч і яшчэ вышэйшыя службовыя асобы, што падзення рубля не будзе! У першыя дні года людзі кінуліся скупляць у крамах побытавую тэхніку і мэблю. Чакалі другой, трэцяй дэвальвацыі. Але астатак года прайшоў спакойна. У тым ліку, дзякуючы стабілізацыйным крэдытам, якія браліся як на Усходзе, так і на Захадзе. Такая цана чаркі і скваркі.

## Антыдоктар года — Валянціна Качан

Галоўны санітарны доктар краіны Валянціна Качан упарта адмаўляла наяўнасць у Беларусі эпідэміі грыпу. Адсутнасць афіцыйнай інфармацыі спарадзіла эпідэмію панікі. У лістападзе людзі хадзілі па вуліцах у павязках. Сёлетні грып найцяжэй пераносілі маладыя людзі. Рэальная колькасць яго ахвяраў так і невядомая. А незалежныя СМІ за аб'ектыўнае асвятленне сітуацыі з грыпам і пнеўманіяй атрымалі папярэджанні ад Міністэрства інфармацыі.

## Памілаваны года — Алег Праляскоўскі

Памілаваны Лукашэнкам Алег Праляскоўскі ўзначаліў Мініінфармацыі. Некалі гэты чалавек засудзіў «Народную волю» на 27 мільёнаў рублёў, а з яго лёгкай рукі з падручнікаў па літаратуры былі скарочаныя творы «пісьменнікаў-нацыяналістаў» — Купалы, Быкава, Барадуліна. Праляскоўская кінулі на адказны ўчастак пад прэзідэнцкія выбары-2010.

## Рэкруты года — Іван Шыла, Франак Вячорка, Зміцер Хведарук

Сёлета ў войска былі прызваныя Франак Вячорка, Іван Шыла, Зміцер Хведарук і іншыя маладыя палітыкі. Лукашэнкаўцы спадзяваліся іх лакалізаваць, зменшыць іхнюю актыўнасць, а не выйшла. У войску кожны з хлопцаў не проста спрабаваў выжыць, але і змагаўся за правы саслужбоўцаў. І Мінабароны раз за разам ішло на саступкі. Ніхто з палітпрызыўнікоў не зламаўся, кожны адстаяў правa карыстацца ў войску беларускай мовай.

## Камбінатар года — Анатоль Ляўковіч

Старшыня сацыял-дэмакатычнай партыі Анатоль Ляўковіч сёлета трапляў у гісторыі. У першы раз — калі рассыпаўся ў кампліментах афіцыйнай уладзе ў інтэрв'ю газеце «Советская Белоруссия». Гэта ледзь не каштавала Ляўковічу месца старшыні партыі. У другі раз Ляўковіч трапіўся на лісце да лідэра партыі «Справедливая Россия» Сяргея Міронава, дзе выступаў большым інтэгратарам за Лукашэнку і прапаноўваў стварыць грамадскую палату саюзнай дзяржавы. Афера, вартая Астапа Бэндэра.

## Цудатворца года — Усэйн Болт

Ямайскі бягун Усэйн Болт на чэмпіянаце свету ў Берліне выйграў стометроўку з фантастычным вынікам — 9,58 секунды! Трыумф чалавечага цела.

**Зміцер Панкавец**

## ЗДЫМКІ ГОДА



Юлія Дарашкевіч

**Беларусь прыме Чэмпіянат свету па хакеі. На фота: Заўзятары ў часе матчу Беларусь—Расія перад экранам каля Палаца спорту.**



**Каму больш балюча? Люты, Гродна.**



**Сёлета ў войска аўральна прызвалі некалькі актывістаў апазіцыі. На фота: люты, Зміцер Хведарук у дзень прысягі.**

## Яны адышлі ад нас у 2009 годзе

**Дзмітры Аксіневіч**, вадналыжнік;
**Станіслаў Маркелаў**, расійскі адвакат;
**Анастасія Бабурава**, расійская журналістка;
**Джон Апдайк**, амерыканскі пісьменнік;
**Валянціна Шчадрына**, перакладчыца беларускай літаратуры на расійскую мову;
**Валянцін Тарас**, пісьменнік;
**Каміла Скамілоўская**, польская кідальніца молата;
**Алег Махнюк**, мастак, дзеяч эміграцыі;
**Ян Арлазораў**, расійскі актор і сатырык;
**Яня Палякова**, салігорская дысідэнтка;
**Лявон Мурашка**, оперны спявак;
**Алег Белавусаў**, кінарэжысёр;
**Мікалай Лагодзіч**, вязень сталінскага ГУЛАГа, антысаветчык;
**Раіса Жук-Грышкевіч**, дзеячка эміграцыі;
**Аляксей Паршчыкаў**, расійскі паэт, перакладчык беларускай літаратуры;
**Марыс Друон**, французскі пісьменнік;
**Фёдар Шмакаў**, найстарэйшы актор віцебскага Коласаўскага тэатра;
**Алесь Пікула**, мясцовы лідэр нацыянальнага руху, Баранавічы;
**Алег Янкоўскі**, расійскі акцёр;
**Аляксандр Патупа**, прадпрымальнік;
**Уладзімір Фурс**, філосаф;
**Аляксандр Міхальчук**, журналіст;
**Георгій Вайнер**, расійскі пісьменнік;
**Сяргей Панькоўскі**, філосаф;
**Майкл Джэксан**, поп–спявак;
**Зінаіда Стагурская**, веласіпедыстка;
**Людміла Зыкіна**, расійская спявачка;
**Васілій Аксёнаў**, расійскі пісьменнік;
**Лешак Калакоўскі**, польскі філосаф і пісьменнік;
**Ян Абабурка**, святар беларускага прыходу ў Манчэстэры;
**Юры Курненін**, славуты футбаліст і трэнер;
**Бобі Робсан**, англійскі футбаліст і трэнер;
**Уладзімір Шатон**, мовазнаўца, лацініст;
**Даніэль Харке**, іспанскі футбаліст;
**Кім Тэ Чжун**, былы прэзідэнт Паўднёвай Карэі;
**Аляксандр Марфіцкі**, лётчык;
**Аляксандр Жураўлевіч**, лётчык;
**Сямён Фарада**, расійскі акцёр;
**Эдвард Кенэдзі**, сенатар ЗША, брат Джона Кенэдзі;
**Сяргей Міхалкоў**, найстарэйшы расійскі пісьменнік;
**Аляксандр Аксёнаў**, былы прэм'ер–міністр БССР;
**Патрык Суэйзі**, амерыканскі акцёр;
**Алесь Касцень**, пісьменнік, журналіст;
**Віктар Лівенцаў**, былы кіраўнік спорткамітэта БССР;
**Баляслаў Шаціла**, былы міністр фінансаў БССР;
**Альгерд Невяроўскі**, журналіст;
**Марыя Чапялёва**, пляменніца Івана і Антона Луцкевічаў;
**Клод Леві-Строс**, філосаф і антраполаг;
**Ігар Старыгін**, расійскі акцёр;
**Анатоль Жук**, акцёр Тэатра юнага гледача;
**Роберт Энке**, варатар зборнай Германіі;
**Раман Трахтэнберг**, анекдотчык, шоумен;
**Валянцін Доўнар**, распаўсюднік незалежных СМІ з Мар'інай Горкі;
**Мілaрад Павіч**, сербскі пісьменнік;
**Пётр Вайль**, расійскі пісьменнік і журналіст, кіраўнік расійскай службы радыё «Свабода»;
**Вячаслаў Ціханаў**, расійскі акцёр;
**Ягор Гайдар**, расійскі эканаміст;
**Уладзімір Турчынскі**, шоумен, культурыст;
**Хасэйн Алі Мунтазэры**, духоўны лідэр іранскай апазіцыі.

# Пяць мыльных бурбалак года

ТОП–5 эканамічных чутак, у якія ахвотна верылі людзі.

### Дэвальвацыя, дэнамінацыя, дэ... — чорт нагу зломіць!

Пасля шакуючай аднамомантнай дэвальвацыі 1 студзеня 2009 г. людзі настолькі спалохаліся фінансавых тэрмінаў на «дэ-», што па краіне адразу ж папаўзлі чуткі: будзе дэнамінацыя. Радыё АБС (хто не ведае — «Адна Баба Сказала») даносіла насельніцтву, што сябар знаёмага знаёмага банкіра ўжо бачыў вагоны з новымі купюрамі на вакзале. Ад родных рублёў павінны былі адкінуць два нулі, а мо і наогул прыраўняць беларускую валюту да расійскай. Па інтэрнэце гуляла нязграбна падпраўленая выява купюры вартасцю 10 тысяч, на якой было напісана 10 рублёў.

Чуткі пакруціліся па зімовай Беларусі, а ўвесну растаялі.

### Зазвінім кішэнямі

«Беларускія манеты адаб'юць у Славаччыне», — паведамленні з такімі сенсацыйнымі загалоўкамі апанавалі інтэрнэт у чэрвені. Яшчэ б! Беларусь — адзіная еўрапейская краіна, якая выкарыстоўвае толькі папяровыя грошы. Манетны двор Славакіі вырашыў выправіць прыкры недахоп і прапанаваў Нацбанку ўзоры металічных грошай. Маўляў, вы толькі пастаўце подпіс, а мы начаканім 100 мільёнаў манет да канца года. Ідэя не выклікала ў Нацбанку энтузіязму. Для ветлівасці беларусы адказалі, што як толькі збяруцца пераходзіць на манеты, адразу звернуцца да славакаў. Дагэтуль не звярнуліся...



### Амерыканскія еўра

Казалі, што вагоны з новымі грашыма стаялі не толькі ў Мінску, але і ў Вашынгтоне. Новая амерыканска-канадска-мексіканская валюта, амера, мусіла прыйсці на замену даляру, які паспеў дыскрэдытаваць сябе ў вачах сусвету, і кінуць выклік еўра. Чым больш абамаўскія падначаленыя адмаўлялі існаванне такіх планаў, тым актыўней увесь свет рыхтаваўся да глабальнага абмену купюр. Даставаць даляры са слоікаў не давялося.

У канцы года пайшлі размовы пра стварэнне сусветнай валюты замест даляра. Такую ідэю падтрымаў нават генеральны сакратар ААН, але яму ўжо ніхто не даў веры. Даляр жывейшы за ўсіх жывых.

### 991-ы апакаліпсіс

Пастанова №991, прынятая Урадам Беларусі ўвечары ў пятніцу 31 ліпеня, прымусіла прадпрымальнікаў пражыць выходныя ў паніцы. Рэакцыя не магла быць іншай — бізнэсменаў праінфармавалі, што фактычна іх выкідаюць з бізнэсу. На шляху пасярэдніцкай дзейнасці дзяржава ўсталёўвала бар'ер. На дзіва, навіна пра пастанову №991 аказалася праўдай. Калі прэса паабяцала чытачам падзабыты дэфіцыт часоў Савецкага Саюза, а прадпрымальнікі тэрмінова аб'ядналіся для барацьбы з адзіным ворагам, рашэнню быў дадзены адваротны ход. Аўтара тэкста, які хуценька збег у адпачынак, яшчэ доўга хавалі ад газетчыкаў і раз'юшаных бізнэсоўцаў. Калі рэзананс аціх, улада прыняла пастанову №1000, якая чымсьці нагадвала 991-ю папярэдніцу, але не чапала прыватнікаў.

### Пятро Пятровіч замест Сяргея Сяргеевіча

Прэм'ера Сяргея Сідорскага «адна баба» адпраўляла ў адстаўку не раз і ў мінулыя гады. Але цяпер народ нават падабраў яму канкрэтную замену — банкір Пракаповіч быў абвешчаны чарговым фаварытам кіраўніка дзяржавы. Эканаміст Леанід Заіка метафарычна параўнаў дзеянні Нацбанка з працай пахавальнай камісіі савецкага ўзору — маўляў, пасада ад Пракаповіча не ўцячэ. Калі ж Лукашэнка даручыў старшыні Нацбанка сфармуляваць прагноз развіцця Беларусі на бліжэйшы год, сумневы адпалі, здаецца, нават у самых адчайных скептыкаў... А непатапляльны Сяргей Сяргеевіч сустракае сёмы Новы год у прэм'ерскім фатэлі.

**Ягор Марціновіч**

## ЗДЫМКІ ГОДА



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Студзень. Шокавая 20-працэнтавая дэвальвацыя рубля выклікала ажыятажны попыт на тавары.**

# Кожны беларус вінен $2000

Агульны замежны доўг краіны да канца года перавысіць адзнаку ў $21 мільярд.

Тэмпы росту агульнай замежнай запазычанасці Беларусі ўражваюць. Паводле дадзеных Нацбанка, за тры першыя кварталы 2009 года ён вырас аж на 27,3%, да $19,3 мільярда. На пачатак кастрычніка ён дасягнуў 37,1% ад ВУП краіны. Прычым кожны квартал тэмпы росту доўгу паскараюцца. Калі ён будзе расці тымі ж тэмпамі, да 1 студзеня паказчык перавысіць $21 мільярд.

І час вяртання асноўнай сумы ўсё набліжаецца.

За дзевяць месяцаў 2009 года на абслугоўванне замежнай запазычанасці было накіравана $4,57 мільярда! Калі ж наступіць час «Х» — 2012 год, у якім прыйдзецца аддаваць грошы і Расіі, і Міжнароднаму валютнаму фонду, — беларускаму бюджэту давядзецца паднапружыцца.

$21 мільярд — гэта мала ці многа? Калі параўнаць з замежным доўгам ЗША, зусім няшмат. Амерыканцы вінны ўжо $13,5 трыльёна, і не надта каб хвалююцца, як будуць аддаваць.

Калі ж адвярнуцца ад іншых і паглядзець на сябе, высвятляецца, што да канца года беларуская запазычнасць перавысіць 40% ад ВУП краіны. На кожнага жыхара Беларусі, ад немаўлятаў да стогадовых, прыпадае $1997 доўгу замежнай запазыкі. Па падліках сайта afn.by, за апошнія 12 гадоў гэты паказчык узрос больш чым у 10 разоў.




Для такой гаспадаркі як беларуская, якая не ўваходзіць у Еўрасаюз з яго страховачнымі механізмамі, бяспечнай мяжой запазычанасці можна лічыць планку 50 або 60% ад ВУП. Яе Беларусь можа дасягнуць за дватры гады.

Тым часам набор пазык працягваецца. Днямі МВФ пералічыў Беларусі яшчэ $688 мільёнаў. А Кітай гатовы пазычыць $3,5 мільярда на рэалізацыю інвестыцыйных праектаў са сваім удзелам.

**Ягор Марціновіч, Сяргей Гезгала**

# За BYR слабейшы толькі быр

Беларускі рубель саслабеў у адносінах да 82 з 83 валют, на якія Нацбанк усталёўвае курсы.

З часу аднамомантнай дэвальвацыі беларускага рубля мінуў амаль год. Нацбанк выконвае перагледжаныя абяцанні трымаць курс айчыннай валюты і рапартуе — рубель саслабее не больш чым на 10%.

Але, калі параўнаць сённяшнюю сітуацыю з той, што была роўна год таму, выходзіць малапрыемная карціна. З 83 валют, на якія Нацыянальны банк Беларусі ўсталёўвае курсы — ці штодзень, ці штомесяц, — у дачыненні да 82 беларускі рубель патаннеў. Слабейшы за нашыя грошы толькі эфіопскі быр, які летась каштаваў 219,85 рубля, а цяпер ацэньваецца ў 219,83 рубля. Выйгрыш нашай валюты склаў 0,01%...

З валютамі, якія карыстаюцца папулярнасцю ў беларусаў, сітуацыя больш складаная.

Даляр замест 2200 рублёў каштуе 2880. Вынік — 30,9% на карысць амерыканскай валюты.

Еўра ўзрос яшчэ мацней, на 33%. Летась за яго можна было атрымаць 3098 рублёў, а цяпер ажно 4144.

Расійскі рубель перажыў крызіс, падобны на той, што напаткаў беларускую валюту. Тым не менш, вырас і ён — ад 78 да 94 рублёў. Рост склаў 20,1%.

Украінская грыўня, якую часамі нават адмаўляліся прымаць у беларускіх абменніках — такой нікчэмнасцю яна ацэньвалася, — усё роўна мацнейшая за нашу валюту. За год яна падаражэла больш, чым еўра: на 33,8% — ад 270 да 361 рубля.

Тое самае і ўсе суседскія валюты — і літ (32,9%), і лат (33%), і злоты (30%)... Беларускі ж рубель працягвае змагацца з эфіопскім бырам.




**ЯМ**

# Адкуль грошы на віцебскія рамонты

**У Рэдакцыю «НН» трапіў ліст, у якім адміністрацыя Віцебскай вобласці «просіць» у прадпрыемстваў Глыбоцкага раёна ахвяраваць 50 мільёнаў рублёў.**

Напалеонаўскія планы губернатара Косінца па рэканструкцыі Віцебска вымагаюць усё больш і больш грошай. Чыноўнікі аблвыканкама пайшлі па вобласці ў палюддзе — райцэнтры вымушаныя «скідацца» на прыгажосць горада Шагала.

Імаверная сума — па $17,5 тысячы з кожнага.

### Дадатковы мільярд

У рэдакцыю «Нашай Нівы» трапіла копія ліста ад 30 лістапада 2009 года, які быў накіраваны ў адміністрацыю Глыбоцкага раёна. У ім першы намеснік кіраўніка Віцебскай вобласці Уладзімір Навацкі просіць арганізаваць «прадастаўленне спонсарскай дапамогі арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці, размешчаных на тэрыторыі раёна для фінансавання выдаткаў на суму 50 мільёнаў рублёў». Ініцыятар ідэі таксама названы: «...у адпаведнасці з даручэннем старшыні Віцебскага аблвыканкама». Такім чынам, збор грошай ажыццяўляецца па ўказанні Аляксандра Косінца.

Каардынацыя збору грошай ускладзеная на намесніка віцебскага мэра Уладзіміра Яравікова. Сродкі збіраюцца на рэканструкцыю плошчы Перамогі ў Віцебску.

«НН» не валодае дакладнай інфармацыяй, якія сумы аблвыканкам «просіць» у іншых раёнаў, апроч Глыбоччыны. Логіка падказвае, што, згодна з прынцыпам сацыяльнай справядлівасці, ахвяраванні мусяць быць прапарцыйнымі. Глыбоцкі раён — не найбагацейшы, але і не найбяднейшы. 50 мільёнаў рублёў — гэта каля 17,5 тысячы даляраў. Вобласць складаецца з 21 раёна, такім чынам, можна падлічыць, што пасля добраахвотна-прымусовага збору набярэцца прыкладна мільярд і пяцьдзесят мільёнаў рублёў — або $368 тысяч.

### Просьбу не дасылалі, але грошы паступаюць

Замест аўтара ліста, віцэ-губернатара Уладзіміра Навацкага, сітуацыю згадзіўся пракаментаваць ягоны памочнік, Віктар Хацянько. Ён узяў дзень на роздум, а пасля паведаміў, што ніякага ліста наогул не было. Паводле ягоных словаў, ён даведаўся ў канцылярыі, што просьбы наконт спонсарскай дапамогі на Глыбоччыну не дасылаліся.

Каардынатар збору грошай, віцэ-мэр Віцебска Уладзімір Яравікоў не адмаўляе, што ахвяраванні паступаюць на рахунак КУП «Капітальнае будаўніцтва горада Віцебска». Ён адмовіўся казаць, якую суму ўжо сабралі, спасылаючыся на «камерцыйную таямніцу». Пад сакрэтам і агульны кошт рэканструкцыі: «Я кожны дзень правяраю, колькі грошай атрымана, — упэўніў віцэ-мэр. — Але ўсе лічбы будуць названыя пасля сканчэння будаўніцтва».



ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
Вул. Гогаля, 6, 210010, г. Віцебск.
Тэл. 23-55-50, факс (0212) 23-55-90
E-mail: vitoblisp@vitebsk.by

ВИТЕБСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
Ул. Гоголя, 6, 210010, г. Витебск.
Тел. 23-55-50, факс (0212) 23-55-90
E-mail: vitoblisp@vitebsk.by

30 НОЯ 2009 № 188-41/1
На № ___ ад ___

Председателю
Глубокского райисполкома
Кондерскому М.М.

О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи

Уважаемый Михаил Михайлович!

В соответствии с поручением председателя Витебского облисполкома по участию всех регионов области в финансировании объекта "Реконструкция площади Победы в г. Витебске" прошу организовать предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи организациями всех форм собственности, расположенных на территории города (района) для финансирования расходов по указанному объекту на общую сумму 50 млн. рублей.

Договора о предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи заключаются с КУП "Капитальное строительство города Витебска" в соответствии с нормами Указа Президента Республики Беларусь от 1 июля 2005 г. № 300 "О предоставлении и использовании безвозмездной (спонсорской) помощи".

Координация работы по данному вопросу осуществляется заместителем председателя Витебского горисполкома Яровиковым В.А. (тел. 36-37-75).

Первый заместитель председателя В.Г. Новацкий

Гребнев 36 48 45
30.11.2009

ГЛЫБОЦКІ райвыканкам
Дата 02.12.2009
Індэкс 01-24/4301

**Памочнік намесніка старшыні Віцебскага аблвыканкама Віктар Хацянько сцвярджае, што гэтага ліста... не было.**

### Куды пойдуць грошы?

Новая цэнтральная плошча Віцебска павінна стаць найбуйнейшай у Беларусі і адной з самых вялікіх у Еўропе. У час святаў на ёй змогуць размясціцца 250—300 тысяч грамадзян, па перыметры будзе расстаўлена пяць агромністых светадыёдных экранаў. Урачыстае адкрыццё плошчы запланаванае на 9 траўня 2010 года.

Першы этап рэканструкцыі каштаваў больш за 5 мільёнаў даляраў, на наступны грошай не хапіла...

З юрыдычнага пункту гледжання да віцебскай сітуацыі не падкапаешся. Указ кіраўніка дзяржавы «Аб прадастаўленні і выкарыстанні спонсарскай дапамогі» — ёсць. Просьба, а не прымус — ёсць. Добраахвотнае — ніводная арганізацыя вобласці не скардзілася — паступленне грошай таксама ёсць.

Толькі чаму за прыгажосць Віцебска мусіць плаціць уся вобласць? Няўжо ў Глыбокім не засталося гістарычна-культурных аб'ектаў, на рамонт ці рэканструкцыю якіх не спатрэбіліся б тыя 17,5 тысячы даляраў? Не — Косінец без тлумачэнняў забірае ўсе сродкі ў абласны цэнтр.

**Ягор Марціновіч**





**Спецыяльна для кампаній Віцебшчыны «НН» падрыхтавала спіс некаторых праектаў, якія неўзабаве будуць ажыццяўляцца ў вобласці.** Раптам на іх таксама не знойдзецца інвестараў, і збіраць грошы прыйдзецца талакой?

Віцебская ГЭС — $230 млн (па $11 млн з кожнага раёна).

Віцебскі Дыснейлэнд — $100 млн (па $4,7 млн з раёна).

Мадэрнізацыя музея Марка Шагала — $2,5 млн (усяго па $120 тыс. з раёна).

## Экс-міністр Навумаў уцякае ў Маскву

**Ён пакідае кіраўніцтва Федэрацыяй хакея і сыходзіць у расійскі бізнэс.**



Юлія Дарашкевіч

Былы міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў вырашыў сысці з пасады старшыні Федэрацыі хакея Рэспублікі Беларусь.

Навумаў паведаміў, што будзе працаўладкоўвацца за межамі Беларусі, таму не зможа надаваць хакею дастаткова часу. Ён назваў сваё рашэнне ўзважаным. «Яно даспела само», паведаміў ён журналістам 18 снежня.

Працаваць Навумаў мае ў Маскве, у сферы бізнэсу. У якасці менеджэра, а не ўласніка, патлумачыў былы міністр.

Удзельнікі пасяджэння выканкама вырашылі правесці справаздачна выбарную канферэнцыю ФХРБ 21 студзеня 2010 г., на якой і будзе абраны кіраўнік хакейнай федэрацыі.

Навумаў адзначыў, што яго не задавальняла тое, што «пачалі спрабаваць прымаць нейкія хакейныя рашэнні не ў федэрацыі, а на баку, і федэрацыю толькі ставілі ў вядомасць пра тое, якое рашэнне прынятае».

Перад Навумавым на працу ў Расію перабраліся некаторыя асобы, што мелі справу з дакументамі па справах аб палітычных выкраданнях, у тым ліку былы старшыня КДБ Мацкевіч, які арыштоўваў падазраванага палкоўніка Паўлічэнку.

**Сяргей Гезгала**

## Здановіч: Мінабароны стварае праблемы Мінадукацыі

**Адмяняюць адтэрміноўку ад прызыву для завочнікаў, якія атрымліваюць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю.**

18 снежня палата прадстаўнікоў у першым чытанні прыняла папраўкі ў закон аб вайсковым абавязку і службе.

Адно з важных новаўвядзенняў — адмена адтэрміноўкі ад прызыву для завочнікаў, якія атрымліваюць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю.

Выступаючы ў сувязі з гэтай прапановай, дэпутат Уладзімір Здановіч адзначыў, што Мінабароны, вырашаючы сваю праблему, стварае значныя праблемы Міністэрству адукацыі. «Што лепш для арміі: баец-малалетка, прызваны пасля некалькіх месяцаў вучобы на завочнай форме, або дарослы баец з завершанай адукацыяй больш высокага ўзроўню? Што лепш для эканомікі краіны?» — рытарычна пытаў дэпутат. Ён згодны, што ў Беларусі намецілася тэндэнцыя зніжэння колькасці мужчын прызыўнога ўзросту. «Але гэта не значыць, што зменшылася колькасць мужчын у цэлым. Ёсць жа яшчэ студэнты вайсковых кафедраў ВНУ, якіх можна прызваць пасля заканчэння вучобы, каля 14 тыс. студэнтаў штогод адлічаюцца з ВНУ і таксама могуць быць прызваныя ў армію», — сказаў У.Здановіч.

Законапраектам таксама прапануецца пашырыць катэгорыю асоб, што прымаюць вайсковую прысягу. Да іх будуць прылічаны студэнты, якія вучацца па праграмах падрыхтоўкі малодшых камандзіраў і афіцэраў запасу.

Згодна з папраўкамі, замацаванае дадатковае абгрунтаванне, па якому дамова з вайскоўцам-«кантрактнікам» можа быць скасавана датэрмінова, за адназначное парушэнне яго ўмоваў. У прыватнасці, за кіраванне транспартным сродкам у нецвярозым стане і з'яўленне ў такім выглядзе на службе.

**Паводле БЕЛТА**

## Таварыства беларускай школы ў Гродне страціла офіс праз безграшоўе

**Штомесячнай платы за арэнду пяць мільёнаў рублёў ТБШ не пацягнула. Знік легендарны асяродак беларушчыны.**

Кіраўніцтва мясцовага Таварыства беларускай школы (ТБШ) больш не можа аплачваць арэнду памяшкання. Плошча офіса ТБШ — амаль 90 кв м. Штомесячная плата разам з падаткам на дададзеную вартасць, камуналкай і паслугамі сувязі складала больш за пяць мільёнаў рублёў.

Паводле словаў старшыні ТБШ Таццяны Канопкінай, «змена месца знаходжання адмоўна не паўплывае на нашу дзейнасць. Мы будзем працягваць ладзіць культурніцкія вечарыны для гарадзенцаў».

ТБШ арандавала офіс ва ўнітарнага прадпрыемства «Форт». Паводле Т. Канопкінай, усе спробы дамовіцца з уласнікам аб зніжэнні цэнаў станоўчых вынікаў не далі.

У гэтым памяшканні гродзенскае аддзяленне ТБШ ладзіла культурна-асветніцкія мерапрыемствы з 2003 года. «Імпрэза адбудзецца па адрасе Будзённага 48а-44 (памяшканне Таварыства беларускай школы). Уваход вольны» — так заканчваліся шматлікія абвесткі пра вечарыны і канцэрты, прэзентацыі і круглыя сталы з удзелам музыкаў, пісьменнікаў, мастакоў, палітыкаў. Аўтографы многіх з іх і цяпер упрыгожваюць сцены офіса.

Перад тым сем гадоў, аж да свайго закрыцця, тут месцілася «Ратуша». Сярод заснавальнікаў «Ратушы» быў вядомы бард Віктар Шалкевіч. «Яшчэ доўга шмат народу будзе ўспамінаць з удзячнасцю гэтае месца, — кажа ён. — Будуць памыляцца дзвярыма і запытваць: «Дзе тут была «Ратуша?», «Дзе цяпер ТБШ?»

**Хрысціна Марчук, Гродна**

# Працаўнікі слонімскага выканкама не падпісваюцца на дзяржаўную прэсу

Ідэалагічны аддзел Слонімскага райвыканкама спрабуе выратаваць сітуацыю з кепскай падпіскай на дзяржаўную прэсу. Начальнік аддзела Ігар Лапікаў разаслаў ліст кіраўнікам упраўленняў і аддзелаў выканкама з просьбай да 24 снежня прадаставіць звесткі аб падпісцы працаўнікоў на «Советскую Белоруссию» і «Слонімскі веснік» «для далейшай праверкі дадзеных праз вузел сувязі і прадастаўлення інфармацыі старшыні Слонімскага райвыканкама». У яшчэ адзін спіс мусяць патрапіць працаўнікі выканкама, якія не падпісаліся на гэтыя газеты.

**euroradio.fm**

Начальнік аддзела ідэалагічнай працы Слонімскага РВК Лапікаў Ігар Сяргеевіч

Кантактны тэл.: (01562) 2–12–34

e-mail: ideologia.slon@tut.by



15.12.2009 № 08-21/155

Начальнику управления, отдела райисполкома

В связи с недопустимо низким уровнем подписки среди работников Слонимского райисполкома на печатные средства массовой информации на I полугодие 2010 года просим обеспечить подписку (не менее чем на квартал) на газеты «Советская Белоруссия» и «Слонімскі веснік» сотрудников Вашего управления, отдела и предоставить до 24.12.2009 г. в отдел идеологической работы информацию о подписке по форме (для дальнейшей проверки данных через узел связи и предоставления информации председателю Слонимского райисполкома):

| Ф.И.О. оформившего подписку | Наименование издания («Советская Белоруссия», «Слонімскі веснік») | Адрес доставки издания | № квитанции, дата подписки | На какой срок оформлена подписка |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Также просим предоставить список работников не подписавшихся на указанные издания.

Начальник отдела идеологической работы Слонимского райисполкома И.С.Лапиков

**Роўнасць СМІ па-лукашэнкаўску.**

# «А можаце прывезці на прэзентацыю саму Ларысу Геніюш?»

Выканаўчы дырэктар выдавецтва «Кнігазбор» **Генадзь Вінярскі** скардзіцца на жахлівае падзенне адукаванасці.

Ён прыгадвае: «Калі мы выдалі зборнік «Філаматы і філарэты», я звязваўся па тэлефоне з кнігарнямі, каб удакладніць, колькі ў іх будзе заказаў. І вось гандлярка адной мінскай крамы перапытвала тавараведа: «Слушай, Зин, там «Беларускі кнігазбор» какую-то книгу религиозную выдал про Филарета. Сколько будем брать?..»

А аднойчы, калі мы выпусцілі Ларысу Геніюш, адна з абласных бібліятэк вырашыла зрабіць прэзентацыю. Дамаўляемся з загадчыцай бібліятэкі, а яна пытаецца: «А хто прыедзе?» Ну, мы пералічваем.

А яна: «А можно привезти саму Ларису Антоновну? Мы вам и бензин оплатим, и машину хорошую...»

**Gazetaby.com**

РЭПЛІКА

## Колькі каштуе любоў

Расія выдасць 50 мільёнаў даляраў астраўной дзяржаве Науру за прызнанне — каго б вы думалі? — Абхазіі і Паўднёвай Асеціі.

Краіна «Вялікай васьмёркі» здолела выгаргаваць лаяльнасць у краіны плошчай 21,3 квадратныя кіламетры, насельніцтвам 14000 чалавек і міжнародная вага якой набліжаецца да абсалютнага нуля, за шалёныя грошы — 3571 даляр на кожнага жыхара!

Вось у гэтых рамках і павінны ісці перамовы з Масквой. Насельніцтва Беларусі, па дадзеных Белстата, складае 9 мільёнаў 663 тысячы 400 чалавек. Калі здолеем дацiснуць Крэмль па «схеме Науру», расійскія фінансы схуднеюць на трыццаць чатыры з паловай мільярды. І гэта толькі за Абхазію і Асецію! А за РЛС у Баранавічах? А за сумеснае гніццё у акопах?

**Уладзіслаў Доўнар-Залескі**

IN MEMORIAM

## Ягор Гайдар: Заканчэнне эпохі



Мільёны савецкіх людзей люта ненавідзелі Гайдара і ягоныя рэформы. Але большасць людзей за гэтыя васемнаццаць гадоў пасля распаду СССР паспелі ператварыцца з савецкіх у расійцаў, беларусаў, украінцаў. І ў гэтым таксама ёсць заслуга Гайдара.

Першы і апошні раз у жыцці мне давялося бачыць яго 18 гадоў таму — у фае беларускага Дома Урада пасля падпісання Белавежскіх пагадненняў. Ён быў тады не ў найлепшай форме, як і іншыя дзяржаўныя мужы, што прыехалі ў Мінск з Віскулёў, дзе адбылося падпісанне гістарычнага дакумента. (Пасля быў, зразумела, банкет і гэта не магло не адбіцца на стане яго ўдзельнікаў...) Ахвотней за іншых з беларускімі журналістамі тады размаўляў Генадзь Бурбуліс. Але і Гайдар, які тады быў віцэ-прэм'ерам, міністрам эканомікі і фінансаў, памятаю, далучыўся да размовы, стаў тлумачыць, што будзе з расійскай эканомікай, з рублём, казаў, што ў бліжэйшы час будуць адпушчаны цэны. Ён прадказваў, што зіма 1992-га будзе суровай ва ўсіх адносінах. Так яно і было.

Пазней, за ўвесь час прабывання Гайдара на пасадзе прэм'ера з крыўднай прыстаўкай «в.а.» (так яму помсціла саўковая наменклатура, якая акапалася ў Думе), не памятаю ніводнай ягонай спробы камусьці спадабацца, прагнуцца, паабяцаць нешта прыемнае, спрабаваць размаўляць з народам на «народнай мове». Часам ён падаваўся марсіянінам, які жыве ў заоблачных вышынях эканамічнай тэорыі і якому няма справы да пакутаў простых грамадзян.

Пераход савецкай адміністрацыйнай сістэмы да капіталістычнай эканомікі не мог быць іншым, акрамя як жорсткім і бязлітасным.

Такім ён быў у Польшчы пры Бальцэровічу, у Чэхаславакіі пры Клаусу, у многіх іншых сацкраінах. Але нідзе свабодзе — найперш, эканамічнай, не супраціўляліся так ярасна, як у Расіі. А кіраўніцтва Беларусі супраціўляецца і дагэтуль.

Два з паловай года таму памёр першы прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын. Імя Гайдара назаўсёды звязана з імем гэтага чалавека.

Сыход абодвух сімвалізуе заканчэнне рэфарматарскай эпохі.

**Віталь Тарас**

## «Нашу Ніву» праверацць. А Вас?

На сайце NN.BY знойдзеце спіс праверак суб'ектаў гаспадарання і фізічных асобаў на 2010 год.

Да кагосьці прыйдзе падатковая, да кагосьці — Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, да іншых — аж Камітэт дзяржкантролю. Складзены спіс праверак беларускіх суб'ектаў гаспадарання на першае паўгоддзе 2010 года. Усяго ў ім — некалькі тысяч прадпрыемстваў і асобаў. У тым ліку і «Наша Ніва».

Многія праверкі КДК правядзе не па ўласнай ініцыятыве, а на загад кіраўніка дзяржавы або па запытах адпаведных ведамстваў.

Раней такі спіс быў для службовага карыстання, сёлета ён выстаўлены ў адкрыты доступ.

**Знайсці спіс можна на сайце NN.BY**

БЕЛАРУСЬ — ЕЎРАСАЮЗ

## Еўрасаюз будзе падтрымліваць развіццё беларускай вёскі

Для рэалізацыі праекта развіцця беларускай вёскі кожны энтузіяст можа атрымаць ад Еўрапейскага Саюза грант памерам да 5 тысяч еўра. Для разгортвання падобных ініцыятываў актывісты могуць разлічваць на дапамогу Еўрасаюза і садзейнічанне ў рамках Праграмы развіцця ААН.

Актыўныя жыхары павінны напісаць план з выразна сфармуляванай стратэгіяй развіцця свайго рэгіёна, зацвердзіць яго ў мясцовай уладзе і падаць заяўку са сваімі прапановамі. Любая разумная і цікавая ініцыятыва абавязкова знойдзе падтрымку сумеснага праекта Праграмы развіцця ААН, Еўрапейскага Саюза і Мінпрыроды Беларусі. Конкурс прадоўжыцца да студзеня 2010 года.

Перспектыўны напрамак — стварэнне «зялёных» маршрутаў, якія вельмі папулярныя ў Еўропе. Такія маршруты праходзяць па экалагічна чыстых месцах, па маляўнічых палях, уздоўж рэчак. Яны звязваюць паміж сабой некалькі населеных пунктаў. Напрыклад, у адным месцы турыст атрымлівае магчымасць папарыцца ў лазні, у іншым месцы — палавіць рыбу, у трэцяй кропцы можна заняцца археалагічнымі раскопкамі. А ў канчатковай кропцы маршруту будзе праходзіць народнае свята.

Яшчэ адна магчымасць прыцягнення турыстаў — стварэнне «экамузеяў», размешчаных уздоўж «зялёных» маршрутаў. «З цікавай прапановай выступіў нядаўна гаспадар адной з аграсядзібаў пад Валожынам, — кажа Алег Сівагракаў, эксперт праекта. — Ён хоча стварыць музей піва! Такі міні-бровар, дзе пры наведвальніках будзе варыцца «жывое» піва, якое можна будзе тут жа і прадэгуставаць».

У Лепелі мясцовыя энтузіясты даўно працуюць з праектам стварэння традыцыйнай беларускай сядзібы, дзе наведвальнікам будуць дэманстраваць народныя віды промыслу, тлумачыць прынцыпы экалагічна чыстага земляробства.

Актывістам вясковага адраджэння варта таксама звярнуць увагу на арганізацыю кірмашоў і фестываляў. Чамусьці лічыцца, што гэта абавязкова трата бюджэтных грошай. Але ж можа быць зусім наадварот! У даўніну ў Вялікім Княстве Літоўскім лічылася вялізным прывілеем атрымаць права на правядзенне кірмашу. І сёння на кірмашах можна вельмі добра зарабляць і папаўняць бюджэт сельскай адміністрацыі.

З дапамогай Еўрасаюза і ПРААН невялікія беларускія гарадкі і вёсачкі абавязкова пачнуць развівацца і рухацца да самадастатковасці. Трэба толькі самім жыхарам зрушыць справу з мёртвай кропкі, а там — дапамогуць і парадай, і бюджэтам.

Кантакты праекта: сайт — www.ecorazvitie.by

Тэлефон: 8 (017) 267 20 21

Пошта: sesd@un.minsk.by

# Дзесяць фактаў пра беларусаў

Чаканыя і нечаканыя вынікі дало апытанне «Нацыянальная ідэнтычнасць у сучасным беларускім грамадстве», зладжанае Беларускім інстытутам стратэгічных даследаванняў і лабараторыяй «Новак» у супрацоўніцтве з кампаніяй «Будзьма беларусамі!».

### 1. Мы — беларусы!

У значнай ступені ці цалкам адчуваюць сябе беларусамі 70% апытаных. Савецкімі людзьмі — толькі 27%.

### 2. Мы — самі!

51% апытаных лічыць, што беларусы — асобны народ са сваёй гісторыяй і культурай. Часткай трыадзінай славянскай нацыі сябе ўспрымае 41% беларусаў.

### 3. Беларус? Шануй карані!

44% рэспандэнтаў лічаць, што толькі той, хто выхаваны на беларускай культуры, можа называць сябе беларусам.

### 4. Мова — нацыянальная каштоўнасць!

Больш за 46% адказалі менавіта так на пытанне пра тое, чым з'яўляецца для іх беларуская мова. Яшчэ 35% сказалі, што гэта нацыянальны сімвал беларусаў. Мова апярэдзіла ў спісе сімвалаў дзяржаўныя герб і сцяг (па 20%), зубра (14%) і бусла (9%).

### 5. Размаўляеш па-беларуску? Рэспект!

49% рэспандэнтаў, адказваючы на пытанне пра тое, што яны думаюць пра людзей, якія размаўляюць выключна па-беларуску, заяўляюць, што гэта сапраўдныя патрыёты. Толькі ад 3 да 6% лічаць, што гэта «апазіцыя», «дзіўныя людзі», «вёска», або «тыя, хто хоча выпендрыцца».

### 6. Беларусы — родам з ВКЛ!

Менавіта Вялікае Княства Літоўскае вызнаюць за гістарычную прарадзіму 38% беларусаў. 17% называюць Полацкае і Тураўскае княствы, 12% — БССР.

### 7. Імя Беларусі —Скарына!

Яго ў якасці найбольш папулярнага нацыянальнага героя прызналі 25% рэспандэнтаў. На другім месцы ідзе Пятро Машэраў, на трэцім — Кастусь Каліноўскі.

### 8. Беларусы — людзі на балоце і гэтым ганарацца!

Менавіта гэты твор Івана Мележа прызнаны найбольш значным творам беларускай літаратуры. Самыя папулярныя беларускія пісьменнікі — Колас, Купала і Быкаў.

### 9. «Песняры» застаюцца найбольш прызнаным нацыянальным брэндам

Каля 40% беларусаў прызналі легендарную рок-групу любімымі нацыянальнымі выканаўцамі.

### 10. Гонар, годнасць, любоў, адказнасць, адданасць

Менавіта гэтыя асацыяцыі выклікае ў беларусаў свая нацыянальнасць. Сорам і абыякавасць — толькі ў 4—5%.

**Віталь Сіліцкі, budzma.org**

# У каметы на хвасце

## Ласкава запрашаем у 1910! Што адбывалася 100 гадоў таму?

Пачнём спачатку: з першага нумара «Нашай Нівы» за 1910 год. «У 1910 годзе з'явіцца на небе камета, — пісаў аўтар, схаваны пад псеўданімам Пядаеў. — Забабонныя людзі кажуць, што камета з'яўляецца перад якім-небудзь няшчасцем, а ёсць і такія, каторыя думаюць, бццам камета наляціць на зямлю, і наступіць канец свету...»

Гэта пра камету Галея, якая ў той год праляцела блізка ля Зямлі. Што, вядома, не магло не адбіцца на беларусах: 6 красавіка 1910 года ў Навагрудку нарадзіўся будучы фізік, распрацоўшчык рэактыўнага паліва для касмічных караблёў Барыс Кіт. Ён зрабіў кар'еру ў касмічным агенцтве ЗША. З Беларусі ён з'ехаў у 1944 г. Пры Сталіне яго як заходнебеларускага інтэлігента чакала куля ў патыліцу, і ён, разумны чалавек, тое адчуваў. За распрацоўку чаўнака «Апалон» Кіт атрымае званне ганаровага жыхара Навагрудка.

А праз чатыры месяцы і тры дні, 9 жніўня, у той самы год у у маёнтку Жлобаўцы Ваўпянскай воласці (цяпер Ваўкавыскі раён) нарадзілася паэтка, адзначаная каметай, — Ларыса Геніюш. Пасля арышту ў Празе, допытаў Цанавы, які патрабаваў ад яе выдаць архівы БНР, і канцлагераў на Інце яна прынцыпова адмовілася прымаць савецкае грамадзянства. Так і дажывала ў Зэльве, цкаваная КГБ. І трапіла ў гісторыю літаратуры як беларуская несавецкая паэтка.

### Больш людскасці

Увогуле, у 1910 годзе камета не чыніла надта вялікіх шкодаў. Наадварот.

Па-першае, 26 жніўня ў Македоніі нарадзілася дабрадзейка сусветнага маштабу маці Тэрэза.

Па-другое, гэты год адзначыўся апошнім ужываннем гільяціны ў заходнім свеце. Было тое 23 лістапада ў Швецыі, а галавы пазбыўся Ёхан Альфрэд Андэр — гвалтаўнік і забойца.

Па-трэцяе, у гэты год 21 чэрвеня прыйшоў на свет забаўляльнік і суцяшальнік соцень тысячаў тых, хто праз трыццаць з нечым гадоў пойдзе на верную смерць. Маем на ўвазе смаленскага паэта Аляксандра Твардоўскага. У адрозненне ад міфічнага чарнакніжніка пана Твардоўскага, таварыш Твардоўскі мог смела насіць званне белакніжніка: ягоныя паэмы пра Цёркіна зробяцца адхланнем і забавай між жахаў Другой сусветнай. Дарэчы, у свой час Твардоўскі, ужо як літаратурны генерал, дзе мог, спрыяў Васілю Быкаву.

Мусіць, тым годам зямля не змагла вытрымаць вялікай колькасці народжаных знакамітасцяў, і, заручыўшыся падтрымкай каметы, прыбрала са свайго аблічча Марка Твена — аўтара «Тома Соера», «Гекльберы Фіна» і выслоўя «чуткі пра маю смерць моцна перабольшаныя».

Дадамо, што нарадзіўся пісьменнік у год папярэдняга з'яўлення каметы, у 1835. Незадоўга перад смерцю Марк Твен зазначыў: «Цяпер, убачыўшы камету і мяне, Усёмагутны скажа: «Ну, ведаеце: ізноў гэтыя дзве дурныя булдавешкі з'явіліся разам!.. А як яны разам прыйшлі, дык, пэўна, трэба, каб яны разам і сышлі». Памёр Марк Твен 21 красавіка.

### Воля для чарнагорцаў і белых афрыканцаў

У год каметы белыя жыхары Паўднёвай Афрыкі, буры, стрэслі з сябе англійскае панаванне. Перамога бураў прынесла белачорны апартэід. Зняволенне Нэльсана Мандэлы будзе няхутка. Пакуль жа ў Букінгемскім палацы, не вытрымаўшы страты калоніі, памёр кароль Эдуард VII, а на ягонае месца заступіў Георг V. Праз паўгода да яго на Імглісты Альбіён пераехаў экс-кароль Партугаліі Мануэль II. Як нябесныя сілы выпраўляюць у дарогу каметы, так уласныя падданыя надалі яму паскарэнне, абвясціўшы рэспубліку 5 кастрычніка 1910 года.

У той год захацелася свабоды і чарнагорцам. Праўда, іх разуменне свабоды рознілася ад партугальскага: 28 жніўня паўстала незалежнае каралеўства Чарнагорыя на чале з Міколам I (не блытаць з Раманавым). Чарнагорская манаршая вольніца працягнулася ўсяго восем гадоў. Пасля іх да сваёй федэратыўнай дзяржавы далучылі сербы. Назад незалежнасць чарнагорцы змаглі забраць толькі ў 2006 г., тым самым спыніўшы існаванне той югаслаўскай федэрацыі.

### Купала або Колас?

Мяркуючы па частотнасці згадак на топлістах першай беларускай газеты з рысункамі — адназначна Янка Купала. 28-гадовы паэт актыўна друкаваўся ў 1910-м: пацешыў у траўні «Курганом», 8 ліпеня — паэмай «Адвечная песня», а ў кастрычніку — зборнікам «Гусляр». У ягонага аднагодкі Якуба Коласа за 1910-ы ўсяго толькі выйшаў у Вільні зборнічак «Песні жальбы». Зрэшты, у Коласа была паважная прычына для творчай пасіўнасці. 1910 год, як і папярэднія два, ён таптаў Пішчалаўскі замак, куды быў пасаджаны царызмам за арганізацыю несанкцыянаванага настаўніцкага сходу. Адзін у адзін як удзельнікі «незраэгістраваных арганізацый» і іншыя «экстрэмісцкія элементы» нашага часу.

### Нічога не нагадвае?

Пакуль вынаходнік канвеера і паспяховы бізнэсовец Генры Форд прадаваў у свеце нечуваную раней колькасць аўто (ажно 10 тысяч!), у Расійскай імперыі скончылася дзеянне закона 1897 года аб нізкіх мытах на сельскагаспадарчыя машыны, «каторыя выпісваюцца з заграніцы».

Раней пры набыцці машыны замежнай вытворчасці мыты спаганяліся цалкам прымальныя: 75 капеек за кожны пуд вагі лакамабіля (не блытаць з аўтамабілем, гэта паравая машына) або паравой малацілкі. Усе астатнія жаткі, сячкарні, малацілкі на конскай цязе, сеялкі і веялкі перавозіліся праз мяжу абсалютна бясплатна. У 1910 годзе падатак на лакамабілі і паравыя машыны падняўся да 3 рублёў 20 капеек з кожнага пуда вагі (аб'ём рухавіка, ці то паравога катла, тады не мералі), а на «іншыя» машыны — да 1 рубля 50 капеек за пуд.

Падвышэння патрабавалі расійскія вытворцы, бо ў імперыі зрабіць машыну каштавала даражэй з прычыны адсталасці тэхналогій. Сабекошт пуда машыны за мяжою быў 3 рублі 13 капеек, а расійскіх — аж 6 рублёў. «Машыну трэба купіць, а, купляючы, пераплачваць удвая толькі дзеля таго, каб падтрымаць расійскіх фабрыкантаў коштам сельскіх гаспадароў», — абуралася тады «Наша Ніва». І дагэтуль абураецца.

### Не глядзіце на Льва

Год каметы не спрыяў падарожжам. Класік сусветнай літаратуры Леў Талстой у кастрычніку вырушыў з Яснай Паляны, а праз колькі тыдняў быў знойдзены сваякамі на маленькай станцыі Астапава, хворы на запаленне лёгкіх і пры сконе. Апошнімі словамі 82-гадовага пісьменніка былі: «Толькі адно раю вам памятаць: ёсць процьма людзей на свеце, акрамя Льва Талстога, вы ж глядзіце на аднаго Льва».

### Металічны радый і 8 сакавіка

Камета спрыяла жанчынам. Напрыклад, Марыя Складоўская-Кюры вынайшла новы хімічны элемент — металічны радый і даследавала яго ўласцівасці. Яна ж стала адной з першых ахвяр такой памятнай у XX стагоддзі радыяцыі. Але мы пра іншае: дзякуючы дасягненням жанчынаў у розных галінах дзейнасці, сусветная жаночая супольнасць у 1910 г. нагэтулькі ўвабралася ў сілу, што наважылася прапанаваць мужчынам прызначыць 8 сакавіка Міжнародным жаночым днём. Гэтую прапанову агучыла Клара Цэткін на другім Інтэрнацыянале ў Капенгагене.

Праз сем гадоў у Пецярбургу святкаванне МЖД вылілася ў жаночы страйк, які некаторыя гісторыкі лічаць пачаткам Лютаўскай рэвалюцыі і краху імперыі. На думку сучасных феміністак, нічым добрым усё гэта не скончылася: у краіне, якую беларусы атрымалі ў выніку, ідэя Клары Цэткін ператварылася ў патрыярхальнае шанаванне «слабога полу» з рэверансамі ў форме адзінага на год гатавання вячэры (сняданку) і разавага вынасу смецця...

### Працяг быў і будзе

Мусім пагадзіцца з аўтарам нашаніўскага артыкула: «забабонныя людзі» памыляліся, і чуткі пра канец свету ў 1910 г. былі моцна перабольшаныя. Хоць гасцяванне каметы супала з лакальнымі пераменамі ды нараджэннем асобаў, якія паўплывалі на лёс чалавецтва. Пядаеў падсумоўвае: «Калі рух каметы Галея адбываецца такім спосабам, што астраномы на многа гадоў наўперад могуць вылічыць, якой дарогай будзе ісці камета, то ясная рэч, што камета не мае нічога супольнага з усім тым, што робіцца ў нас на зямлі».

Аўтар трымаўся пазітывізму. Прыхільнікі гэтай тэорыі вераць, што кожнай з'яве ёсць навуковае тлумачэнне ды, па вялікім рахунку, усё ў нашых руках. Такой пазіцыі трымаецца і цяперашняя «Наша Ніва». З Новым годам!

**Павал Касцюкевіч, Алесь Пілецкі**

## ЗДЫМКІ ГОДА



**Верасень. Лукашэнка наведаў краіну ЕС: Літву. Карыстаючыся свабодным доступам да цела, рэпарцёры незалежных СМІ зафіксавалі ягоны гадзіннік. Высветлілася, што ён каштуе 16 тыс. даляраў.**


**Лістапад. Прэзідэнт Расіі Дзмітры Мядзведзеў даў інтэрв'ю беларускім журналістам. Упершыню былі запрошаны таксама рэдактары незалежных СМІ.**



**Верасень. У Польшчы на авіяшоу разбіўся беларускі самалёт Су-27. Лётчыкі Аляксандр Марфіцкі і Аляксандр Жураўлевіч не катапультаваліся, каб адляцець далей ад людзей. Прычыны катастрофы вядомыя, але не афішуюцца.**



**У год лібералізацыі палкоўнік Дзмітрый Паўлічэнка з'явіўся перад камерамі СМІ толькі раз: на Вадохрышча.**

# 2010

## 600-годдзе Грунвальда



### Студзень
**1** — Новы год.
**4** — 50 гадоў таму (1960) у аўтакатастрофе загінуў пісьменнік Альбер Камю.
**6** — 400 гадоў таму (1610) памёр Андрэй Волан, дзяржаўны дзеяч, філосаф, правазнаўца. Сакратар трох каралёў Рэчы Паспалітай. Ідэолаг рэфармацыйнага руху на нашых землях.
**6** — Тры Каралі ў каталікоў, Вадохрышча ва ўніятаў.
**7** — Раство Хрыстова ў праваслаўных.
**8** — 75 гадоў (1935) ад нараджэння спевака Элвіса Прэслі.
**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.

### Люты
**2** — Грамніцы ў каталікоў.
**8** — Масленіца ў праваслаўных.
**8** — 200 гадоў таму ў мястэчку Ула (цяпер Бешанковіцкі раён) нарадзіўся слынны жывапісец XIX ст. Іван Хруцкі.
**12** — 100 гадоў ад першай пастаноўкі тэатральнай трупы Ігната Буйніцкага.
**14** — Дзень святога Валянціна (Дзень закаханых).
**15** — Грамніцы ў праваслаўных (іншая назва Стрэчанне).
**17** — Папелец у каталікоў.
**19** — 75 гадоў Народнаму артысту Беларусі, актору Купалаўскага тэатра Генадзю Аўсяннікаву.
**24** — 75 гадоў Народнаму паэту Беларусі Рыгору Барадуліну.
**28** — Пурым у юдэяў.

### Сакавік
**3** — Міжнародны дзень пісьменніка.
**8** — Юбілейны Міжнародны жаночы дзень. 100 гадоў таму нямецкая сацыялістка Клара Цэткін прапанавала прызнаць 8 сакавіка Днём барацьбы за жаночыя правы.
**11** — 25 гадоў таму (1985) на пасаду кіраўніка КПСС быў абраны Міхаіл Гарбачоў. Пачалася перабудова, якая ўрэшце прывяла да атрымання Беларуссю незалежнасці.
**17** — 100 гадоў ад нараджэння пісьменніка Хведара Ілляшэвіча.
**25** — Дзень Волі.
**28** — 25 гадоў таму памёр мастак Марк Шагал.
**30** — Пейсах у юдэяў.

### Красавік
**1** — Дзень Дурня.
**4** — Вялікдзень у праваслаўных і каталікоў.
**6** — 100 гадоў фізіку і дзеячу беларускай эміграцыі Барысу Кіту (жыве ў Франкфурце–на–Майне).
**13** — Радаўніца.
**20** — 100 гадоў ад трагічнай смерці Сяргея Палуяна, літаратуразнаўцы, які адкрыў талент Багдановіча.
**21** — 100 гадоў таму памёр амерыканскі пісьменнік Марк Твен.
**26** — Дзень Чарнобыльскай трагедыі.

### Май
**1** — Дзень працы.
**1** — 300 гадоў таму салдаты расійскага цара Пятра I узарвалі Сафійскі Сабор у Полацку.
**3** — Міжнародны дзень свабоды друку.
**4** — 20–годдзе абвяшчэння незалежнасці Латвіі.
**5** — Дзень святой Еўфрасінні Полацкай.
**9** — Дзень перамогі над фашызмам.
**9** — Дзень Еўропы.
**11** — Дзень святога Кірылы Тураўскага.
**18** — 100 гадоў таму памерла Эліза Ажэшка, польска–беларуская пісьменніца, якая жыла ў Гродне.
**23** — Тройца ў праваслаўных і каталікоў.
**24** — Дзень славянскага пісьменства.

### Чэрвень
**1** — Міжнародны дзень абароны дзяцей.
**1** — 100 гадоў таму ў Гомелі была заснаваная першая беларуская футбольная каманда ПГФК (Першы гомельскі футбольны клуб).
**23** — Купалле.
**28** — Сабор беларускіх святых.
**29** — Пятра і Паўла у каталікоў, уніятаў.

### Ліпень
**2** — Дзень Маці Божай Будслаўскай, апякункі Беларусі.
**7** — Святы Іван у праваслаўных.
**12** — Пятра і Паўла ў праваслаўных.
**13** — 750 гадоў таму войскі Вялікага Княства Літоўскага разбілі крыжакоў ля возера Дурбе (цяпер Латвія).
**15** — 600 гадоў Грунвальдскай бітве.

### Жнівень
**6** — Перамяненне Божае ў каталікоў, уніятаў.
**9** — 100 гадоў ад нараджэння паэткі Ларысы Геніюш.
**11** — Пачатак месяца Рамадан у мусульманаў.
**14** — 625 гадоў Крэўскай уніі.
**15** — Унебаўзяцце ў каталікоў, уніятаў.
**15** — 50 гадоў Ігару Варашкевічу, лідэру рок–гурта «Крама».
**19** — Перамяненне Гасподняе (Яблычны Спас) у праваслаўных.
**28** — Спленне ў праваслаўных.

### Верасень
**8** — Дзень беларускай вайсковай славы.
**9** — Канец Рамадана ў мусульманаў.
**9** — Рош Ашонэ (Новы год) у юдэяў.
**27** — Узвіжанне Крыжа Гасподняга ў праваслаўных.
**28** — Міжнародны дзень глухіх.

### Кастрычнік
**1** — Міжнародны дзень музыкі.
**1** — Пакроў ва ўніятаў, каталікоў.
**26** — Пакроў у праваслаўных.
**31** — Ірландска–амерыканскае свята Хэлоўін.

### Лістапад
**1** — Усе святыя ў каталікоў.
**2** — Дзяды.
**16** — Успамін (Дзень) Маці Божай Вастрабрамскай.
**17** — Курбан–Байрам (Свята прынашэння ахвяры) у мусульманаў.
**26** — 100 гадоў таму нарадзілася сусветная дабрадзейка маці Тэрэза.
**28** — Пачатак Піліпаўкі, посту перад Божым Нараджэннем у праваслаўных.

### Снежань
**3** — Дзень бульбы. Лічаць, што ў гэты дзень у Еўропу з Амерыкі была ўпершыню прывезеная бульба.
**10** — Дзень правоў чалавека.
**17** — Дзень беларускага кіно.
**25** — Божае Нараджэнне ў каталікоў, уніятаў, пратэстантаў.

### Юбілеі года
**625** гадоў ад Крэўскай уніі.
**600** гадоў ад Грунвальдскай бітвы.
**550** гадоў ад нараджэння палкаводца Канстанціна Астрожскага.
**200** гадоў ад нараджэння мастака Івана Хруцкага.
**100** гадоў ад нараджэння паэткі Ларысы Геніюш.
**100** гадоў беларускаму футболу.
**100** гадоў ад выдання першай «Кароткай гісторыі Беларусі» Вацлава Ластоўскага.
**75** гадоў ад выхаду рамана Кузьмы Чорнага «Трэцяе пакаленне».
**75** гадоў народнаму паэту Рыгору Барадуліну.
**50** гадоў Ігару Варашкевічу, лідэру гурта «Крама».
**50** гадоў ад выхаду рамана Івана Мележа «Людзі на балоце».

### Студзень

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

### Люты

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |

### Сакавік

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

### Красавік

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | | |

### Май

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

### Чэрвень

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

### Ліпень

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

### Жнівень

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | 31 | | | | | |

### Верасень

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | | | |

### Кастрычнік

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

### Лістапад

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |

### Снежань

| пн | аўт | ср | чц | пт | сб | ндз |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

Сёлета найлепшай кнігай, на думку экспертаў «НН», стала «Нацыянальнасць — Беларус» гісторыка **Алега Латышонка**.

# Найлепшыя кнігі 2009




Сёлета сярод экспертаў не было аднагалосся, што назіралася ў папярэднія гады. Розныя кнігі ўзначалілі іх рэйтынгі. Не было аднаго выдання, якое б аднолькава ацанілі і літаратурныя аглядальнікі, і навукоўцы. Бо ўсё ж у краіне выдаецца вялікая колькасць беларускіх кніг. У асноўным, дзякуючы працы недзяржаўных выдавецтваў.

Сярод названых 65 выданняў пераважае гістарычная і публіцыстычная літаратура. Па дзве гістарычныя кнігі Алега Латышонка, Алеся Краўцэвіча і Міхаіла Галдзянкова былі названы экспертамі. Публіцыстыку рэпрэзентуць лідэры выніковага рэйтынгу — Антон Луцкевіч «Барацьба за вызваленне» і Сяргей Дубавец «Як?»

Усё менш месца застаецца мастацкай літаратуры. А з таго, што чытаюць, перавагу аддаюць прозе. Найпапулярнымі сталі кнігі «Цэнтр Еўропы» Уладзіміра Някляева і «Нічые» Андрэя Федарэнкі. Паэзія сёлета прадстаўлена толькі адным зборнікам — «Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся» Уладзіміра Арлова. Хаця па разу-другім згадваліся і зборнікі паэтаў Генадзя Бураўкіна, Алеся Разанава, Ігара Бабкова.

Эксперты назвалі некалькі кніг, пазначаных 2008 годам выдання, але якія сталі даступнымі чытачу фактычна толькі ў 2009 г. Гэта «Браты Гарэцкія» Радзіма Гарэцкага, «Гістарычны атлас Беларусі» і «Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага» Аляксандра Краўцэвіча.

Ёсць у рэйтынгу і адна аўдыёкніга — «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча. Такі фармат пакуль не стаў масавым у Беларусі, але ўсё больш і больш кніг выходзіць на дысках.

Кругагляд экспертаў абмежаваны ў асноўным мінскімі выдавецтвамі. Усіх было названа больш за два дзесяткі. І сярод іх толькі два знаходзяцца па-за межамі Мінска (праект «Гарадзенская бібліятэка» і выдавецтва Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта) і яшчэ чатыры — у іншых краінах (ЗША, Літва, Польшча, Расія).

Лідэрамі, па колькасці згаданых кніг, з'яўляюцца незалежныя выдавецтвы «Логвінаў», «Медысонт» і «Кнігазбор». Сярод дзяржаўных — «Мастацкая літаратура».

Выніковы рэйтынг падаецца паводле падліку балаў па дзесяцібальнай шкале. За кожнае першае месца ў спісе налічваецца 10 балаў, за другое — 9 і гэтак далей.

**Найлепшыя кнігі папярэдніх гадоў**

**2008** — Галасы з-за небакраю: анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах ХХ ст. Уклаў Міхась Скобла. — Мінск: Лімарыус;

**2007** — Павел Севярынец. Лісты з лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі/«Кнігарня «Наша Ніва»;

**2006** — Юры Туронак. Мадэрная гісторыя Беларусі: збор твораў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі;

**2005** — Генюш Ларыса. Каб вы ведалі: з эпісталярнай спадчыны (1945—1983) — Мінск: Лімарыус

**Дзясятка найлепшых кніг 2009 года выглядае так:**

1. Алег Латышонак. Нацыянальнасць — Беларус. — Вільня: Інстытут Беларусістыкі/Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства — **28 балаў**.

2. Антон Луцкевіч. Барацьба за вызваленне. Уклаў Анатоль Сідарэвіч. — Вільня: Інстытут беларусістыкі/ Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства — **21 бал**.

3. Уладзімір Някляеў. Цэнтр Еўропы. — Мінск: Медысонт/ Кнігарня пісьменніка — **18 балаў**.

4. Вадим Деружинский. Тайны беларуской истории. — Мінск: ФАУінформ — **17 балаў**.

5—8. Сяргей Дубавец. Як? — Радыё Свабодная Еўропа/ Радыё Свабода;

Сяргей Шапран. Васіль Быкаў: Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах. Т1, 2 — Мінск/Гародня: Бібліятэка Бацькаўшчыны/Гарадзенская бібліятэка;

Алег Трусаў. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. — Мінск: Кнігазбор;

Андрэй Федарэнка. Нічые. — Мінск: Мастацкая літаратура — па **16 балаў**.

9—10. Уладзімір Арлоў. Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся. — Мінск: Логвінаў/Кнігарня «Наша Ніва»;

Беларускія Александрыя, Троя, Трышчан... Перакладная белетрыстыка Беларусі XV—XVII стст. Уклаў Алесь Бразгуноў. — Мінск: Беларуская навука/Беларускі кнігазбор — па **15 балаў**.

**Спісы найлепшых кніг, складзеныя экспертамі:**

**Цэнтр беларускай кнігі ў Гродне:**
1. Алесь Краўцэвіч. Рыцары і дойліды Гародні. — Гародня/Уроцлаў: Гарадзенская бібліятэка.
2. Алег Латышонак . Жаўнеры БНР. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
3. Сяргей Шапран. Васіль Быкаў: Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах. Т1, 2 — Мінск/Гародня: Бібліятэка Бацькаўшчыны/Гарадзенская бібліятэка.
4. Рышард Капусцінскі. Імперыя. — Мінск: Логвінаў/ Кнігарня «Наша Ніва».
5. Алесь Белы. Наша страва. — Мінск: Логвінаў/ Кнігарня «Наша Ніва».
6. Зрабаваны народ: размовы з беларускімі інтэлектуаламі. Гародня/Уроцлаў: Гарадзенская бібліятэка.
7. Альгерд Бахарэвіч. Сарока на шыбеніцы. — Мінск: Логвінаў.
8. Андрэй Чарнякевіч, Ігар Трусаў. Гарадзенскі Новы свет і ваколіцы. — Мінск: Лімарыус.
9. Борис Клейн. Недосказанное. Имена. — Мінск: Лімарыус.

**Ася Паплаўская,** літаратурны журналіст:
1. Уладзімір Някляеў. Цэнтр Еўропы. — Мінск: Медысонт/ Кнігарня пісьменніка.
2. Віктар Казько. Бунт незапатрабаванага праху. — Мінск: Логвінаў/Кнігарня «Наша Ніва».
3. Вольга Іпатава. Знак вялікага магістра. — Мінск: Медысонт/ Кнігарня пісьменніка.
4. Андрэй Федарэнка. Нічые. — Мінск: Мастацкая літаратура.
5. Кастусь Цвірка. Воўчая выспа. — Мінск: Медысонт/ Кнігарня пісьменніка.
6. Барыс Пятровіч. Піліпікі. Мінск: — Галіяфы.
7. Віктар Вальтар. Выбраныя творы. — Мінск: Кнігазбор.
8. Леанід Дранько-Майсюк. Анёлак і я. — Мінск: Галіяфы.
9. Уладзімір Арлоў. Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся. — Мінск: Логвінаў/ Кнігарня «Наша Ніва».
10. Ігар Бабкоў. Засынаць, прачынацца, слухаць галасы рыб. — Мінск: Логвінаў.

**Алесь Мазанік,** гандляр кнігамі, «Кніжны кірмаш»:
1. Віктар Шалкевіч. Блюз Вясна. — Мінск: Медысонт/ Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў».
2. Адам Глобус. Play.by. — Мінск: Логвінаў.
3. Уладзімір Някляеў. Цэнтр Еўропы. — Мінск: Медысонт/ Кнігарня пісьменніка.
4. Ніл Гілевіч. Выбраныя творы. — Мінск: Кнігазбор.
5. Генадзь Бураўкін. Выбраныя творы. — Мінск: Кнігазбор.
6. Алесь Разанаў. Сума немагчымасцяў. — Мінск: Логвінаў.
7. Уладзімір Арлоў. Усё па ранейшаму, толькі імёны змяніліся. — Мінск: Логвінаў/Кнігарня «Наша Ніва».
8. Алег Латышонак. Нацыянальнасць — Беларус. — Вільня: Інстытут Беларусістыкі/Беларускае гістарычнае таварыства.
9. Анатоль Вярцінскі. Выбраныя творы. — Мінск: Кнігазбор.
10. Віктар Вальтар. Выбраныя творы. — Мінск: Кнігазбор.

**Арсень Ліс,** літаратуразнаўца:
1. Гістарыяграфія 1920-х гг.: Сярэднявечча і ранньемадэрны час. Уклаў Алег Дзярновіч. ARCHE № 7.
2. Антон Луцкевіч. Барацьба за вызваленне. Уклаў Анатоль Сідарэвіч. — Вільня: Інстытут беларусістыкі/Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства.
3. Уладзімір Конан. Выбранае. — Мінск: СМЭЛТАК.
4. Радзім Гарэцкі. Браты Гарэцкія. — Мінск: Медысонт/Бібліятэка Бацькаўшчыны.
5. Алег Латышонак. Нацыянальнасць — Беларус. — Вільня: Інстытут Беларусістыкі/Беларускае гістарычнае таварыства.
6. Алег Трусаў. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. — Мінск: Кнігазбор.
7. Сяргей Дубавец. Як? — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
8. Ніл Гілевіч. Збор твораў. Том 16. Паэты і пісьменнікі Беларусі. — Мінск.
9. Вольга Іпатава. Знак вялікага магістра. — Мінск: Медысонт/Кнігарня пісьменніка.
10. Кастусь Цвірка. Воўчая выспа. — Мінск: Медысонт/ Кнігарня пісьменніка.

**Людміла Рублеўская,** літаратурны аглядальнік газеты «Беларусь сегодня»:
1. Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны. — Мінск: Мастацкая літаратура.
2. Андрэй Федарэнка. Нічые. — Мінск: Мастацкая літаратура.
3. Пятро Васючэнка. Ад тэксту да хранатопа. — Мінск: Галіяфы.
4. Міхась Скобла. Акно для матылькоў. — Мінск: Про Хрысто.
5. Ніна Мацяш. У прыгаршчах ветру. — Мінск: Літаратура і мастацтва.
6. Барыс Пятровіч. Піліпікі. — Мінск: Галіяфы.
7. Альгерд Бахарэвіч. Сарока на шыбеніцы. — Мінск: Логвінаў.
8. Ягамосць. Зборнік прысвячэнняў Анатолю Сысу. — Мінск: Медысонт/Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў».
9. Віктар Шалкевіч. Блюз Вясна. — Мінск: Медысонт/ Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў».
10. Усевалад Гарачка. Багі і героі. — Мінск: Галіяфы.

**Алесь Пашкевіч,** гісторык:
1. Гістарычны атлас Беларусі. Том І. Беларусь ад старажытных часоў да канца XVIII ст. — Варшава/ Мінск.
2. Асоба і час: беларускі біяграфічны альманах. — Мінск: Лімарыус
3. Сяргей Шапран. Васіль Быкаў: Гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах — Мінск/ Гародня: Бібліятэка Бацькаўшчыны/Гарадзенская бібліятэка.
4. Алег Гардзіенка. Беларускі Кангрэсавы Камітэт Амерыкі (БККА). Смаленск: БІНІМ/Бібліятэка Бацькаўшчыны.
5. Алесь Белы. Наша страва. — Мінск: Логвінаў/ Кнігарня «Наша Ніва».
6. Алег Латышонак. Нацыянальнасць — Беларус. — Вільня: Інстытут Беларусістыкі/Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства.
7. Аляксей Карпюк. Развітанне з ілюзіямі. — Гародня/Уроцлаў: Гарадзенская бібліятэка.
8. Антон Луцкевіч. Барацьба за вызваленне. Уклаў Анатоль Сідарэвіч. — Вільня: Інстытут беларусістыкі/Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства.
9. Сяргей Дубавец. Як? — Радыё Свабодная Еўропа/Радыё Свабода.
10. Мітрафан Доўнар-Запольскі. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага Княства Літоўскага пры Ягелонах. — Мінск: Беларуская навука.

**Ірына Зубар,** мінская кнігарня «Эўрыка»:
1. Михаил Голденков. Русь — другая история. Украина. Беларусь. Литва. — Мінск: Інтэрпрэссервіс.
2. Михаил Голденков. Утраченная Русь. Забытая Литва. Неизвестная Московия. Запрещенная Беларусь. — Мінск: Сучасная школа.
3. Вадим Деружинский. Тайны беларуской истории. — Мінск: ФАУінформ.
4. Аксана Катовіч, Янка Крук. Залатыя правілы народнай культуры. Перавыданне. — Мінск: Адукацыя і выхаванне.
5. Краўцэвіч Аляксандр. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Трэцяе выданне. — Беласток: Вышэйшая Школа Публічнай Адміністрацыі імя Станіслава Сташыца.
6. Воздвигнутые на пьедестал. О памятниках боевой славы на территории Республики Беларусь. — Мінск: Кнігазбор.
7. Грюнвальд в источниках: хроника конфликта Владислава, короля Польши с крестоносцами в год Христов 1410. — Пінск: ПалескДзУ.
8. Алег Трусаў. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. — Мінск: Кнігазбор.
9. Роман Павлович. Минская область в огненном вихре сорок первого. — Мінск, СМЭЛТАК.

**Алесь Асіпцоў,** журналіст з Магілёва:
1. Сяргей Дубавец. Як? — Радыё Свабодная Еўропа/ Радыё Свабода.
2. Антон Луцкевіч. Барацьба за вызваленне. Уклаў Анатоль Сідарэвіч. — Вільня: Інстытут беларусістыкі/ Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства.
3. Алег Латышонак. Нацыянальнасць — Беларус. — Вільня: Інстытут Беларусістыкі/Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства.
4. І.Я. Яшкін. Слоўнік беларускіх імёнаў. — Мінск: Адукацыя і выхаванне.
5. Адзін дзень палітвязня. — Радыё Свабодная Еўропа/ Радыё Свабода.
6. Юры Друкахруст. Акцэнты Свабоды. — Радыё Свабодная Еўропа/ Радыё Свабода.
7. Ігар Пушкін. Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20-30 гады XXI стагоддзя). Дакументы і матэрыялы. — Мінск: Медысонт.
8. Рышард Капусцінскі. Імперыя. — Мінск: Логвінаў/ Кнігарня «Наша Ніва».
9. Алесь Белы. Наша страва. — Мінск: Логвінаў/ Кнігарня «Наша Ніва».

**Інтэрнэт-крама Prastora.by:**
1. Анджэй Суліма Камінскі. Рэспубліка супраць аўтакратыі. Рэч Паспалітая і Расія ў 1686—1697 гадах — Мінск: Логвінаў/Кнігарня «Наша Ніва».
2. Уладзімір Арлоў. Усё па-ранейшаму, толькі імёны змяніліся. — Мінск: Логвінаў/Кнігарня «Наша Ніва».
3. Уладзімір Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім (аўдыёкніга). — Мінск: BelTonMedia.
4. Крынічка. Чытанка: для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. — Мінск: Мастацкая літаратура.
5. Мікалай Плавінскі. Нарысы гісторыі клінковай зброі X—XIII стагоддзяў на Беларусі. — Мінск: Логвінаў.
6. Беларускія Александрыя, Троя, Трышчан... Перакладная белетрыстыка Беларусі XV—XVII стст. Уклаў Алесь Бразгуноў. — Мінск: Беларуская навука/ Беларускі кнігазбор.
7. Лісіца-хітрыца. Беларускія народныя казкі для дзяцей малодшага школьнага узросту. Апрацоўка Алеся Якімовіча. — Мінск: Літаратура і мастацтва.
8. Гаўф Вільгельм. Халоднае сэрца. Пераклад з нямецкай і паслямова Альгерда Бахарэвіча. — Мінск: Галіяфы.
9. Хрустальны калодзеж. Казкі народаў Еўропы ў дзвюх кнігах. Кніга 2. — Мінск: Мастацкая літаратура.
10. Віктар Казько. Бунт незапатрабаванага праху. — Мінск: Логвінаў/Кнігарня «Наша Ніва».

**«Акадэмкніга», Мінск:**
1. Беларускія Александрыя, Троя, Трышчан... Перакладная белетрыстыка Беларусі XV—XVII стст. Уклаў Алесь Бразгуноў. — Мінск: Беларуская навука/ Беларускі кнігазбор
2. Вадим Деружинский. Тайны беларуской истории. — Мінск: ФАУінформ
3. Алег Трусаў. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. — Мінск: Кнігазбор
4. Анатоль Грыцкевіч. Старонкі нашай мінуўшчыны. — Мінск: Кнігазбор
5. Алег Латышонак. Нацыянальнасць — Беларус. — Вільня: Інстытут Беларусістыкі/Беласток: Беларускае гістарычнае таварыства
6. Мітрафан Доўнар-Запольскі. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах. — Мінск: Беларуская навука
7. Михаил Голденков. Русь — другая история. Украина. Беларусь. Литва. — Мінск: Інтэрпрэссервіс

**Падрыхтаваў Кастусь Матушыч**

# «Ляпісы», фестывалі, юбілеі

**2009 год прайшоў пад знакам фестываляў і юбілееў. Таксама сёлета незалежная музыка прарвалася на тэлебачанне.**

А зоркай №1 працягвае заставацца «Ляпіс Трубяцкі». Сяргей Міхалок атрымаў сёлета рок-карону, а таксама ўпотайкі ад сваіх фанаў запісаў новы альбом «Культпрасвет».

«Ляпісы» — адзіны айчынны рок-гурт, які здолеў два гады запар збіраць дзевяць тысяч чалавек на свой канцэрт у мінскі Палац спорту. Пасля былі туры па гарадах Беларусі і ЗША. І пастаянныя канцэрты ў Расіі. Праўда, наступны год можа ўжо не быць «годам «Ляпісаў»: Міхалок задумаўся над тым, каб «пару гадоў адпачыць» пасля такой гастрольнай і студыйнай працы.

## Фестывалі года

У 2009 годзе апошні раз прайшла «Рок-каранацыя». Надалей яна згубіць прыдомак «Рок-» і зробіцца проста «Каранацыяй», што мае прыцягнуць на яе і больш «папсовых» музыкаў. Апроч таго, фестываль робіцца вандроўным. Сёлета ён праходзіў у Маладзечне.

Наўзамен у 2009-м стартануў рок-фестываль BelaMusik. На ім выступілі ізноў нядаўна забароненыя «Крама», «Нейра Дзюбель», «Палац», а таксама «Без білета», J:МОРС, «Дзецідзяцей». Канцэрт быў немасавы — мо залева адпалохала гледачоў, — але арганізатары выказаліся за далейшую падтрымку BelaMusik.

Транспамежны фестываль Be2gether у літоўскіх Нарвілішках набірае з кожным годам усё большы размах. Хоць Беларусь там прэзентуюць толькі лічаныя гурты, цікавасць да яго расце. На сёння гэта самы блізкі і самы вялікі міжнародны рок-фестываль, на які без праблем могуць паехаць беларусы. Нават шэнгенская віза не стрымлівае: яе выдаюць бясплатна тым, хто набыў квіткі на Be2gether.

Тое самае і фестываль Be Free, які ў 2009-м прайшоў у Чарнігаве. Папулярнасць яго расце, ладзіць фестываль варта і надалей. Вось толькі трэба недзе асесці, спыніцца з вандраваннямі. Так, ужо з 2010 фэст можа займець пастаянную прапіску ў Чарнігаве. Прапіску памяняў і іншы фестываль — «Рок за баброў». Ён пераехаў з Бабруйска ў Сілічы пад Лагойскам.

А найстарэйшы беларускі рок-фестываль «Басовішча» сёлета адсвяткаваў 20-годдзе. У гонар гэтага арганізатары адмовіліся ад традыцыйнай конкурснай праграмы, зладзілі проста шоу. Узгадалі самыя першыя канцэрты ў беластоцкім Гарадку: N.R.M. пераўвасобіўся ў «Мрою», «Крама» — у «Бонду».

З'явіўся сёлета і канкурэнт «Бардаўскай восені», што ладзіцца ў Бельску на Беласточчыне. Цяпер пад Бабруйскам штогод будзе праводзіцца бардаўскі фестываль «Вішнёвы сад». У адрозненне ад «Бардаўскай восені», на новым фэсце няма конкурснай праграмы.

Былі сёлета і страты. Арганізатары фестывалю «Бітлз назаўжды», які праіснаваў пяць гадоў, адмовіліся яго далей праводзіць. Пасля ўвядзення новых мытных пошлін на ўвоз тавараў спонсары адмовіліся яго падтрымліваць.

## Беларус Аляксандр Рыбак

На «Еўрабачанні-2009» у Маскве перамог беларус Аляксандр Рыбак. Вось толькі прадстаўляў ён Нарвегію. Але перамога Рыбака на конкурсе прынесла папулярнасць і нашай краіне. Пра Беларусь загаварылі ў Еўропе з добрай нагоды. А вось беларускі канкурсант Пятро Ялфімаў пасля няўдалага выступу на «Еўрабачанні» яшчэ і паскандаліў. «Мару хутчэй дабрацца да роднай Беларусі і патрапіць на прыём да прэзідэнта, каб расказаць яму, як усё тут адбываецца», — сказаў пакрыўджаны спявак. Маўляў, не ўсё чыста з грашыма, якія выдаткоўваліся на падрыхтоўку да конкурсу. Пётр Ялфімаў і заяву адпаведную напісаў у праваахоўныя органы, што прывяло да праверкі на Белдзяржрадыёкампаніі.

Не спраўдзіў чаканняў на дзіцячым «Еўрабачанні» і «Чароўны трусік» Юрыя Дземідовіча. Хаця пароза Юравай папулярнасці не зменшыла. Мо таму, што не скандаліў, як Ялфімаў.



**Май. Нарвежскі беларус Аляксандр Рыбак трыумфальна перамог на «Еўрабачанні» з песняй «Казка». І заадно прымусіў задумацца: што значыць быць беларусам цяпер?**

## Паплаўская папулярнейшая за Калдуна

Амаль 40% беларусаў не ведаюць ніводнага айчыннага выканаўцы. Такія вынікі паказала даследаванне сацыялагічнай лабараторыі «Новак» і Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. З тых, каго назвалі астатнія, самымі папулярнымі аказаліся Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч. Модны Дзмітрый Калдун — толькі на дзясятым месцы, пасля Аляксандра Саладухі. Сярод гуртоў рэйтынг узначалілі «Песняры». Затым ідуць «Сябры», «Верасы»... N.R.M. — дзявяты.

## Круглыя даты

У 2009 годзе споўнілася сорак гадоў легендарным «Песнярам». Адзначалі юбілей шырока і ўсе паразнаму. Вось толькі кожны пасвойму. Бо на прасторах Беларусі і Расіі спяваюць некалькі калектываў, якія прэтэндуюць на спадчыну Уладзіміра Мулявіна. Дваццацігоддзе сустрэў і вечназялёны «Нейра Дзюбель». Пасля адмены забароны на яго канцэрты гурт часта выступае ў Мінску. Па дзесяць гадоў споўнілася «БН» і J:МОРС. Калі «Песняры» і J:МОРС запісалі новыя альбомы, дык «Стары Ольса» да свайго дзесяцігоддзя заснаваў цэлы фестываль старажытнай музыкі «Гальшанскі замак». Ён праходзіў у аднайменным мястэчку. І па планах арганізатараў павінен стаць штогадовым.

Канцэрт да 15-годдзя N.R.M. можна назваць самым чаканым выступам года. Да гэтага гурт маўчаў працяглы час, што нарадзіла шмат чутак. Але N.R.M. вярнуўся. І як паказаў снежаньскі акустычны канцэрт, «мрояўцы» вярнуліся каралямі.

**Па выніках продажаў у дыскарнях Мінска найпапулярнымі сталі:**

1. J:МОРС — «Аквамарин»
2. «Ляпіс Трубяцкі» — «Культпросвет»
3. «Без білета» — «Африка»
4. БДА«Песняры» — «Вольному — воля»
5. «Дзецідзяцей» — «Отлично»
6. Дзмітрый Калдун — «Калдун»
7. «Городская тоска» — «Там, где нас нет»
8. Ірына Дарафеева — «Я живу в заповедном краю»
9. Дзядзя Ваня — «The Best №1»
10. «Стары Ольса» — «Лепшае»

**На аснове статыстыкі з дыскарняў «Музычны рай», «Праспект», «Містэрыя гуку».**

## Пазітывы года

Увосень у Мінск з канцэртам прыязджалі электрапанкі The Prodigy. Зоркі такой велічыні ў Беларусі бываюць нячаста. Следам за імі да нас завітае «Рамштайн».

Адкрыццём можна назваць гурт The Toobes. Выданне іх альбома рыхтуецца ў Англіі. А ў Беларусі альбом «HELLO» сайтам Experty.by быў прызнаны лепшым у першым паўгоддзі.

Незалежная музыка трапіла сёлета на дзяржтэлебачанне. На тэлеканале СТБ запусцілі праект «Зорны рынг», у якім узялі ўдзел «Нейра Дзюбель», «Крама», Зміцер Вайцюшкевіч. Але па-ранейшаму такія выпадкі з'яўляюцца хутчэй выключэннямі, чым заканамернасцю.

У рамках праекта «Тузін. Перазагрузка» па-беларуску заспявалі дванаццаць раней небеларускамоўных выканаўцаў. Сярод іх Дакота, Юрый Дземідовіч, Сяргей Пукст, гурты Atlantica, «Стокс».

**Падрыхтаваў Кастусь Матушыч**

## ЗДЫМКІ ГОДА



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Ліпень. Патоп на Нямізе.**




PHOTO.BY/MEDIA.NET

**Літоўская пракуратура звінавачіла ксяндза з Мосара (Глыбоцкі раён) Юозаса Бульку ў саўдзеле ў забойстве літоўскіх партызанаў пасля вайны.**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Лістапад. Беларусь пацярпела ад эпідэміі дзіўнага грыпу, які суправаджаўся ўсплёскам пнеўманій.**

15 снежня споўнілася 150 гадоў з дня нараджэння вынаходніка эсперанта Людвіка Заменгафа. Не ўсе ведаюць, што ён быў наш зямляк. І гэта не адзіны вялікі моўны рэфарматар з Беларусі.

# Край прыдуманых і адроджаных моваў

Заменгаф ствараў усеагульную мову дзеля таго, каб знішчыць міжнацыянальную непрыязь. Выгадаваны ў Беластоку, дзе жылі беларусы, палякі, габрэі і немцы, Людвік быў сведкам як шматмоўя, так і частых міжнацыянальных супярэчнасцяў. Ён зрабіў выснову, што ўніфікацыя моваў дапаможа розным народам ды этнічным групам лепей паразумецца. «Цэлая сотня найзначнейшых вынаходстваў не зробіць чалавецтву такой вялікай і каштоўнай рэвалюцыі, як уводзіны нейтральнай міжнароднай мовы», — казаў ён...


Людвік Заменгаф.


Бен-Егуда, які рэанімаваў іўрыт, таксама нарадзіўся ў Беларусі.


Ян Максімюк спрабуе затрымаць знікненне падляшскай гаворкі, выпрацоўваючы яе пісьмовы варыянт.

**Гаворыць перакладчык і паліглот Сяргей Шупа:** Ад часу Заменгафавага вынаходства свет перажыў мноства канфліктаў, у якіх загінулі мільёны людзей. Якое там паразуменне!

Нават калі б усе людзі на свеце гаварылі адной мовай — усё адно знайшлі б, за што пасварыцца і пазабіваць адзін аднаго.

Што дапамагло былой Югаславіі, дзе ўсе бакі канфлікту гаварылі на адной мове? Не разумею, калі гавораць пра «модную цяпер шматкультурнасць». Шматкультурнасць — натуральны стан рэчаў шмат дзе ў прасторы і ў часе. Ці «модна» было сярод местачковых беларусаў сто гадоў таму гаварыць (або хоць бы разумець) на ідышы? Наважуся пастуляваць формулу: «Не ведаю>не разумею>баюся>ненавіджу». Трэба хутчэй не мову ўніверсальную прыдумляць, а наладжваць усе магчымыя дыялогі між культурамі, каб разбіць гэты закляты ланцуг.

...Але Заменгаф лічыў, што праблемы вырашацца, калі стварыць нейтральную мову і забараніць карыстальнікам мяняць фундамент гэтай мовы. Спрабуючы быць бестаронні м у справе вынаходства мовы, геніяльны, але як усякі чалавек абмежаваны ў сваіх далягядах, Людвік Заменгаф не здолеў пазбыцца перагібаў. У яго эсперанта відавочна пераважаюць раманскія моўныя элементы (запазычанні з французскай, іспанскай), пры поўнай адсутнасці неіндаеўрапейскіх каранёў...

**Сяргей Шупа:** Заменгаф думаў местачковымі ўсходнееўрапейскімі катэгорыямі. Ну, дзе тая нейтральнасць па-за славяна-рамана-германскім кантэкстам? Эсперанта было і застанецца чужым для шмат каго з еўрапейцаў, не кажучы пра кітайскамоўны або арабскамоўны свет, дзе эсперанта гучыць як яшчэ адна мова еўрапейскіх імперыялістаў.

Цяпер жа моўныя тэндэнцыі ў Эўропе самыя розныя, ніякай адназначнай «моды» няма: і амерыканізацыя (ну, гэты працэс павярхоўны, і тут няма чаго палохацца), і вяртанне да каранёў — пурыстычныя барыкады ў Францыі або Літве, і ўздымы моўнага рэгіяналізму (Каталонія, Валія), і ціхае паміранне (лужыцкая мова ў Нямеччыне).

Я вось з хваляваннем і спагадай назіраю за бадай што аднаасобнымі высілкамі майго сябра Яна Максімюка затрымаць знікненне падляшскай мовы праз выпрацоўку новага пісьмовага стандарту, запрашаю наведаць сайт svoja.org.

...«Ці неабходная міжнародная мова? Гэтае пытанне сваёй наіўнасцю выкліча смех у будучых пакаленняў. Як нашыя сучаснікі засмяяліся б, напрыклад, пачуўшы пытанне «Ці трэба нам пошта?» — казаў Заменгаф.

Сёння, бы тое эсперанта, англійская заняла месца ўніверсальнай мовы. І ўзнікае пытанне пра небяспеку такога панавання міжнародных, нібыта больш важных моваў над іншымі...

**Сяргей Шупа:** Варта адрозніваць мову камунікацыі і мову культуры. У гэтым і палягае іерархія, яе не трэба ствараць, яна для кожнага месца і часу стварaецца сама. Англійская мова дапаможа паразумецца з прадстаўніком іншай культуры, але наўрад ці шмат дапаможа ў далучэнні да іншай культуры, апрача вельмі павярхоўнага азнаямлення.

Спецыфічная сітуацыя Беларусі ў тым, што шырокія масы страцілі сваю мову культуры (на якой стагоддзямі перадаваўся культурны код — з усёй ідыяматыкай, сінтаксісам, мадэлямі мыслення), і пачынаюцца спробы стварэння культуры на мове камунікацыі. Нешта падобнае сто гадоў таму ў Ірландыі прывяло да з'яўлення Джойса і Ейтса. Але ў Ірландыі ўплыў культурнага субстрату, незалежнага і арыгінальнага, быў непараўнальна большы. Так што, калі ў Беларусі татальна запануе расійская мова, ёй будзе наканавана навекі застацца культурнай правінцыяй Расіі.

...Заменгаф ад дзеда-прадзеда быў паліглотам: ягоны бацька Марк і дзед Фабіян выкладалі замежныя мовы. Дый сам Людвік быў выдатным моўным педагогам. Ягоны «Падручнік нямецкай мовы для расійскага юнацтва» вытрымаў чатырнаццаць перавыданняў, перавыдавалася і ягоная «Параўнаўчая расійска-польска-французска-нямецкая фразеалогія».

Дарэчы, Заменгаф быў не адзіны, хто ў гэтай частцы Еўропы выношваў такі амбітны моўны праект. У мястэчку Лужкі (цяпер Шаркоўшчынскі раён) у 1859 г. нарадзіўся яшчэ адзін энтузіяст — Эліезэр Бен-Егуда, якому прыйшла ў галаву думка адрадзіць старажытную габрэйскую мову, каб на ёй размаўлялі сучасныя габрэі...

**Сяргей Шупа:** Можна сказаць, што некалі Беларусь як шматмоўная, шматкультурная тэрыторыя — людзі ў нас умелі гаварыць на дзвюх-трох-чатырох мовах — была спрыяльным месцам для такіх з'яваў. Аднак пачатак адраджэння іўрыта ў Беларусі наўрад мае дачыненне да самой Беларусі. З гэткім жа поспехам тое магло адбыцца ў любым іншым кутку «рысы аселасці». Пагартайце «Еврейскую энциклопедию» — біяграфіі нашых землякоў-юдэяў сведчаць аб іх надзвычайнай геаграфічнай мабільнасці, непрывязанасці да канкрэтнага месца. Шкада, што Беларусь гэтую гістарычную выпадковасць — тое, што рэаніматар іўрыта нарадзіўся тут — мала выкарыстоўвае і не мае з гэтага ніякіх культурніцкіх працэнтаў. Думаю, больш выпадае гаварыць пра нейкую адмоўную карму Беларусі — гэта месца, дзе мовы паміраюць, а не адраджаюцца. Памёр ідыш (не забывaймася, што БССР была адзінай дзяржавай свету, дзе ідыш быў адной з афіцыйных моваў), амаль памёрлі ўсе крэсовыя польскія дыялекты, памёрлі ўнікальныя ўсходнелітоўскія дыялекты, ледзь жывая беларуская мова...

...Лета 1887 г. Заменгаф публікуе па-расійску сваю кнігу, падпісаную псеўданімам Д-р Эсперанта: «Міжнародная мова. Прадмова і поўны падручнік». Гэтым ён дае магутны імпульс да ўзнікнення і развіцця такога граматычнага і культурнага феномену як штучна створаная мова эсперанта. Больш за дзесяць гадоў руплівай працы па супастаўленні граматычных формаў у розных, пераважна еўрапейскіх мовах. Людвік Заменгаф зарабляе акулістам то ў Варшаве, то ў Беластоку, то ў Гродне, пакрысе дасканаліць сваю мову. Асцерагаючыся кпінаў, сваю працу ўдзень робіць акуліст, уначы — мовабудаўнік. Ён стварае эсперанта таемна, адкрыўшыся ўсяго некалькім знаёмым.

Але эсперанта, нягледзячы на вялікую колькасць энтузіястаў і тытанічныя намаганні стваральніка, так і не зрабілася ўсеагульнай мовай Еўропы. Гэтаму шмат прычынаў: гістарычных (пачатак Першай сусветнай) і культурных (узышлі зоркі нямецкай і англійскіх моваў у якасці міжнародных). Адмоўны досвед — усё адно досвед. Галоўнае — зрабіць з яго слушныя высновы.

**Сяргей Шупа:** Заменгаф будаваў мову на пустым месцы, у прабірцы, без культурна-гістарычных падмуркаў. Таму ягоная няўдача не мусіць нас засмучаць. Беларуская мова мае свае карані і крону, мае сваё месца ў культурным кантэксце, мае вялізны корпус натуральна ўзніклых тэкстаў. Усё гэта выгадна адрознівае яе ад эсперанта і дае спадзевы на выжыванне. Астатняе залежыць ад нас. Так, сапраўды, перакладаць трэба ўсё, і асабліва серыялы і этыкеткі. А стратэгія беларусізацыі ясная — пачаць з тэлевізіі, з чынавенства і сферы паслуг. Тады адукацыя ўсіх узроўняў — не прымушаць, але паўсюль стварыць спрыяльныя ўмовы. І праз пару гадоў без ніякіх законаў усё стане на месца.

**Склаў Лявон К**

**Сяргей Шупа**

знаўца харвацкай, чэшскай, эстонскай, літоўскай, партугальскай, французскай, іўрыту, польскай, англійскай моваў. Перакладчык на беларускую Мерымэ, Мапасана, По, Борхеса, Шульца, Керэта, Дарэла, Грэймаса, Ергавіча, Мілаша, Віяна, Джойса.

# Яшчэ адна сняжынка

**Вера Бурлак.** Калядная казка.

Калі яно ўпала ў снег, спачатку ўсе падумалі, што гэта проста яшчэ адна сняжынка. Але яно не было белым. Яно было цёплым, шэрым, нашмат цяжэйшым нават за градзіну і, упаўшы на зямлю, працягвала варушыцца, замест таго каб, як належыць прыстойнай сняжынцы, ціха ляжаць на месцы.

Сняжынкі, што сашчапіліся і перакрыжаваліся пяшчотнымі гранямі, здзіўлена перамаўляліся паміж сабой, але ціха-ціха. Яны прызвычаіліся да таго, што іх нерухомы танец раз-пораз пляжылі цяжкія боты або іншыя груваcткія прадметы. Так, далёка не ўсім шанцавала ўвесь дзень празіхацець пад марозным сонцам — і не адзін дзень! Былі, вядома ж, такія шчаслівіцы, але яны нараджаліся пад шчаснаю зоркаю. Сёння такой зоркі не было. Неба зацягнулі хмары, у паветры вісела вільгаць, і балетныя фігуры сняжынак прасядалі самі сабой — ад уласнай вагі. Таму яны не пакрыўдзіліся на шэры прадмет, а нават прыціснуліся бліжэй да яго, каб разам з ім зрабіць новую балетна-акрабатычную канструкцыю.

— Пастаў ножку сюды.

— А ты трошкі падсунь спаднічку.

— А я прытрымаю рукой прамяні на тваёй шапачцы.

— Ты, шэранькая сняжынка, цяжкаватая, але не страшна, ляжы, мы вытрымаем.

— Ты рухаешся, і нашыя фігуры робяцца цікавейшымі!

Шэранькая сняжынка прыслухоўвалася да новых белых сябровак і рабілася нерухомай.

А ў паветры плаваў туман, вільгаць, як вялізная лапа, ціснула неба да зямлі, і сняжынкі з цяжкасцю трымаліся, расцякаліся іх крышталікі.

— Ты цяжкая і шэрая, — сказалі яны новай сяброўцы, — і мы цяжкія і шэрыя. Але мы растаем, а ты — не. Вазьмі нашую пяшчоту і лёгкасць — бо мы не здолеем яе захаваць.

Тут крысо шэрага пінжака адхінулася, і паказалася маленькая чырвоная ручка, сціснутая ў кулачок. І сняжынкі аддалі ў гэтую ручку сваю пяшчоту і лёгкасць.

Як толькі яны зрабілі гэта, згары, але не такой высокай, як нябёсы, на іх сыпанула жоўтае зерне. На яго адразу наляцелі птушкі. Важкія галубы забуркаталі, атабарваючыся, верабейчыкі зачырыкалі, выхопліваючы зярняткі, каб з'есці іх недзе побач. Бокам-скокам то адтуль, то адсюль набліжалася каўка і таксама час ад часу падавала голас, а на агароджу прысела хітрая таўстадзюбая варона.

Птушкі дзяўблі зярняты і пярэсцілі снег новымі крышталічнымі формамі сваіх лапак. А вялікі шэры скрутак ляжаў пасярод іх і штохвілі варушыўся. Птушкі пабойваліся скрутка. Некалькі зярнятак упала на яго, але да іх птушкі не падыходзілі.

— Нейкая бурбалка ў бурносе, — буркалі галубы. — Яшчэ абурыцца і ўсё навокал разбурыць...

— А можа, пашчасціць — і не, — запярэчылі верабейкі.

Варона са сваёй агароджы пазірала вельмі цікаўна і прамаўляла:

— Прыўкррасны скррутак! А раптам у ім нешта смачнае і каррыснае! Глядзіцца перррспектыўна!

Тут згары сыпанула новая порцыя зерня. Птушкі спачатку разляцеліся, але хутка вярнуліся і працягнулі дзяўбці. А з шэрага пінжака, які ўсё намагаўся разгарнуць вецер, на іх пазіралі блакітныя вочкі.

— Глядзіць! Цішэй! Глядзіць! — загаманілі верабейкі і адляцелі ўбок.

— Бураціна нейкі, — буркнулі галубы.

Але істота з шэрага пінжака глядзела на іх спакойна і нават лагодна. А ружовы кулачок трохі расціснуўся, быццам таксама насыпаў бы птушкам зерне, каб меў.

— Чалавечак, чалавечак, — сцішана паўтаралі верабейкі. — Чаго хочаш?

— Жыць, — дала адказ маленькая істота. Не словамі, бо іх яшчэ не мела, але неяк інакш — замест словаў.

— Мы баімся цябе, — сказалі ўсе птушкі, — але ты не крыўдзіш нас. Ты — як нашыя птушаняты. Напэўна, ты добрае, і, калі вырасцеш, будзеш нас карміць. Мы падорым табе крылы. Спачатку ты гэтага не адчуеш, але калі-небудзь, калі табе падасца, што ты падаеш, ты здолееш узляцець.

Тут усе птушкі падхапіліся з зямлі і зляцелі, бо да іх набліжаліся цяжкаватыя крокі. Толькі варона на сваёй агароджы засталася чакаць.

Падмоклыя валёнкі спыніліся ля шэрага скрутка, вялікая чорная постаць схілілася над ім, а рука, якая шпурляла птушкам зерне, разгарнула скрутак. У ім было зусім маленькае дзіця. Ручкі і ножкі сагнутыя, пальчыкі падціснутыя. Але блакітныя вочы глядзелі надта разумна.

— Аёечкі, жах які! — сказала чорная постаць і зняла з сябе ватоўку. — Узяла б я цябе, ды не магу. У мяне толькі два сябры — старасць і алкаголь. Але табе такое сяброўства непатрэбнае.

Старая загарнула дзіця ў ватоўку, але сысці не спяшалася. А малое глядзела на яе разумнымі вочкамі.

— Здаецца, я ведаю, каго паклікаць. Але для гэтага мне трэба пайсці. Шкада, няма ў мяне сяброў у чалавечым свеце!

Дзіця, загорнутае ў ватоўку, зноў засталося адно, але зусім ненадоўга. Вецер, які ўжо зазіраў пад пінжак і пра ўсё ведаў, прыляцеў зноў.

— Я той, хто дахі рве, у трубах раве, але для цябе я лагодны, я цябе пaберагу. Я дам табе маю сілу.

А на агароджы ўсё сядзела варона і кідала позіркі на дзіця. А ззаду і знізу падкрадалася кошка. Варона заўважыла яе, але да часу маўчала, і толькі ў апошні момант, калі кошка ўжо нарыхтавалася скочыць, з усяе моцы закрычала:

— Гэта некарррэктна!

Бедная кошка ажно прыціснула галаву. Але не разгубілася. Дзве хітрухі былі вартыя адна адной.

— Нешта сёння пахмуррна, — заўважыла кошка, сядаючы на заднія лапкі і лізнуўшы пярэднюю. Сыходзіць яна не збіралася, таму варона палічыла за лепшае зляцець.

— Пазнюся на каррферэнцыю! — патлумачыла яна, і толькі крылы залопалі ў паветры.

— Цяпер яна будзе з табой сябраваць, — сказала кошка малому. — Каго яны не могуць перамагчы, з тымі сябруюць. Пакуль не пабачаць новай магчымасці іх перамагчы. Але не давай ім сябе перамагчы — і яны будуць табе сябрамі. Ты падабаешся мне. Ты малое і мілае, як мае кацяняты. Кажуць, у кошак дзевяць жыццяў, а ў мяне дзевяць кацянят. І кожнае так хоча жыць!

Кошка зірнула на малое і працягвала — а працягваць яна магла доўга, бо гэта была вельмі гаваркая кошка:

— Не разумею, чаму людзі кідаюць сваіх дзяцей? Але людзі кідаюць і сваіх кошак. Ды яны ўвогуле шмат чаго кідаюць. Бо ў іх замала ласкі і гонару. Не будзь такім! Вось табе ад мяне падарунак — трохі болей ласкі і гонару за звычайныя чалавечыя. А ў мяне яшчэ шмат. Мне хопіць.

Кошка ўзнялася на лапкі, аблізнула забруджанае футрачка:

— Ну, бывай! Пайду да сваіх кацянят!

Насамрэч кошка пасядзела б яшчэ. Яна любіла паразважаць, а блакітнавокае дзіця было надзвычай удзячным слухачом. Але ўжо здалёк кошка пабачыла сабаку, а з ім гутарыць ёй не хацелася.

Сабака падбег да малога і адразу пасяброўску лізнуў яго ў нос. І адразу расхваляваўся:

— Як! Чаму ты тут? Дзе твой дом? Малое дзіця мусіць быць дома! Дзе твая мама?

— Не ведаю, — адказала дзіця быццам не словамі, а позіркам.

— Хто ж, хто ж гэта зрабіў! — турбаваўся сабака. — Давай нападзем на след! Не, след растаў. Трэба цябе ратаваць! Давай разам!

— Як? — спытала дзіця.

— Крычы! Гэта вельмі дапамагае! Калі я крычу, зло адыходзіць, а дабро набліжаецца. Я ўсё жыццё крычу. І ты не хвалюйся. Галоўнае — крычы! Ну, давай разам!

І яны закрычалі разам, хто як умеў. Сабака, праўда, хутка пабег — не інакш па дапамогу, — а дзіця працягвала крычаць, і яму вельмі падабалася крычаць. Гэта было як спеў. І сняжынкі зноў пачалі падаць з нябёсаў і кружыцца ў танцы. І варона баялася зноў падляцець. А дзіця крычала штосілы, і з'яўляліся і выходзілі ў свет ягоная першыя пачуцці: радасць і прага жыцця — і бясконцае неразуменне, чаму няма да каго прытуліцца, апрача бруднай ватоўкі.

І тут да яго падышла жанчына ў зялёнай хусціне з кветкамі. Яна загарнула малое ў сваю прыгожую хусціну і панесла.

— Хто ты? — спытала малое, але жанчына толькі ўсміхалася. Але колькі лагоды і дабрыні бачыла дзіця ў расплывістых плямах яе вачэй, носа, вуснаў — бо інакш малое бачыць пакуль не ўмела. — Ты... мама?

— Я Жыццё, — адказала жанчына. — Аднойчы я зрабіла памылку, але цяпер выпраўла.

Яна прыціснула дзіця да сябе, і тое адчула, што такое сапраўдная цеплыня. Яно было само цуд, і цуд адбыўся з ім. Дзіця заснула і ў сне бачыла новыя цуды.

Неба ачысцілася, схапіўся марозік, і сняжынкі кружыліся ў танцы і садзіліся на зямлю і адна на адну, утвараючы вытанчаныя жывыя фігуры. Заўтра сонца будзе граць на іх, і ўсе спыняцца перад іх прыгажосцю. І, магчыма, ім пашчасціць пратрымацца не адзін дзень — можа, нават цэлы месяц!

*3 снежня 2009*

## ЗДЫМКІ ГОДА



**Красавік. Невядомыя стрэлілі з гранатамёта ў помнік Леніну ў Пецярбургу (Расія).**



**Часам і сабаку такое жыццё абрыдне.**




## КАНЦЭРТЫ

### Дзецідзяцей

**10 студзеня а 19-й у малой зале к/з «Мінск»** выступіць гурт «Дзецідзяцей» з рок-князёўнай Ганнай Хітрык.

### Awindar

**28 снежня ў 11-м корпусе БНТУ (вул.Хмяльніцкага, 9)** адбудзецца канцэрт гурта Awindar пад кіраўніцтвам Масуда Талібані. Гэты музыка добра вядомы аматарам беларускага фолку, дзякуючы сумеснай працы з гуртом Krywi, Пітам Паўлавым, Юрыем Выдронкам. Ягоны ўласны ансамбль спалучае матывы беларускіх народных песень і курдскага фальклору, фольк-драйв і лірычную мілагучнасць. Беларускія цымбалы спаборнічаюць з іранскімі сетарам, дарбукам і дафам. **Пачатак а 19-й.** Квіткі можна набыць у галоўным корпусе БНТУ (Міжнародны студэнцкі цэнтр, кабінет 333). Кошт квіткоў — 5000 рублёў.

## ІМПРЭЗЫ

### Прэзентацыя новага часопіса

**7 студзеня ў Чырвоным касцёле** — вечарына-прэзентацыя першага нумара новага літаратурна-мастацкага часопіса «Верасень». У імпрэзе бяруць удзел: Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дайнека, Алег Трусаў, Уладзімір Някляеў, Леанід Дранько-Майсюк, Віталь Рыжкоў, Таццяна Беланогая. Вядучы вечарыны — паэт і бард Эдуард Акулін. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

### Вазьміце беспрытульнага сабаку

**Тэатр беларускай драматургіі (вул.Крапоткіна, 44) 26 снежня** сумесна з грамадскай арганізацыяй абароны жывёлаў «Эгіда» пачынае бестэрміновую акцыю «Я ёсць, я тут». Тэатр прадставіць гледачам новы спектакль паводле п'есы Ягора Конева «Гісторыя двух сабак». У фае тэатра ўсталююць стэнд, на якім супрацоўнікі «Эгіды» будуць размяшчаць фотаздымкі сабак і катоў, якім трэба гаспадары.

## ВЫСТАВЫ

### Працы Юдаля Пэна

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 31 студзеня** працуе выстава «Калекцыя прац Пэна», прысвечаная 155-годдзю з дня нараджэння мастака. Выстаўляюцца зборы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Гэта першая выстава твораў славутага Юдаля Пэна ў Мінску.


ЮДАЛЬ ПЭН. СВАТ.

### Планета Беларусь

**У Літаратурным музеі Янкі Купалы да 31 снежня** працуе выстава фотамастака Сяргея Плыткевіча «Планета Беларусь». На выставе можна ўбачыць Беларусь з вышыні птушынага палёту, самыя нечаканыя вобразы нашай краіны.

## ТЭАТРЫ

### 24 снежня

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр лялек** — «Халоднае сэрца»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»

### 25 снежня

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»

### 26 снежня

**Тэатр оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Тэатр лялек** — «Пiпi Доўгаяпанчоха»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Тэр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Востраў Сахалін»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»

### 27 снежня

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Тэатр оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Тэатр оперы і балета** — «Яўгеній Анегін»

### 28 снежня

**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Купалаўскі тэатр** — «Прыгоды Заранкі і Янкі»
**Тэатр юнага гледача** — «Цётухна Прастуда і Новы год»
**Купалаўскі тэатр** — «Старамодная камедыя»

### 29 снежня

**Тэатр лялек** — «Чырвоны Каптурык»
**Тэатр юнага гледача** — «Цётухна Прастуда і Новы год»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**Тэатр оперы і балета** — «Тры парсючкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Translations»

### 30 снежня

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Гісторыя двух сабак»
**Тэатр юнага гледача** — «Цётухна Прастуда і Новы год»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»

### 1 студзеня

**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»

### 2 студзеня

**Тэатр лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Купалаўскі тэатр** — «Паўлінка»
**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»

### 3 студзеня

**Тэатр лялек** — «Пiпi Доўгаяпанчоха»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Купалаўскі** (малая сцэна) — «Зіма»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»

### 4 студзеня

**Тэатр лялек** — «Марозка»
**Купалаўскі тэатр** — «Афрыка»
**Купалаўскі тэатр** — «Памінальная малітва»

### 5 студзеня

**Тэатр лялек** — «Пінокіа»
**Тэатр імя Горкага** — «Сунічная паляна»

### 6 студзеня

**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

### 7 студзеня

**Тэатр лялек** — «Прыгоды алавянага жаўнерыка, пастушкі і камінара»

### 8 студзеня

**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр імя Горкага** — «Пакінутая жанчына (Мачаха)»
**Купалаўскі тэатр** — «Хам»
**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Востраў Сахалін»

### 9 студзеня

**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»
**Купалаўскі тэатр** — «Каханне ў стылі барока»

## КІНО

### Аватар: Фіялетавая містыка Джэймса Кэмерана




**Аватар** (Avatar)
ЗША, 2009, каляровы, 162 хв.
**Рэжысёр:** Джэймс Кэмеран
**Ролі выконваюць:** Сэм Уортынгтан, Зоі Салдана, Сігурні Уівэр, Стывен Лэнг, Мішэль Радрыгес, Джавані Рыбізі
**Жанр:** Фантастычныя прыгоды
**Адзнака:** 8 (з 10)

Марскі пехацінец Джэк Салі адпраўляецца на планету Пандора, дзе людзі здабываюць каштоўныя мінералы. З дапамогай адмысловага цела, аватара, створанага з ДНК чалавека і мясцовых тубыльцаў, герой мусіць увайсці ў давер да племені На'ві. Паміж зямлянамі і пандорцамі выспявае канфлікт...

Карціна Джэймса Кэмерана — трыумф тэхналогій. Фіялетавыя іншапланетнікі, светлавыя дрэвы, паветраныя рэптыліі... Толькі кусаеш локці, што глядзіш на гэта не ў 3D IMAX.

Антыімперыялізм Кэмерана на гэты раз запакаваны ў супертэхналагічную абгортку. Ашаламляльнае відовішча.

**Андрэй Расінскі**



# Партызанскімі сцежкамі

**Як патрапіць на заблакаваны інтэрнэт-сайт — інструкцыя для «чайнікаў».**

«НН» паведамляла, што ў краіне распрацоўваецца ўказ «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт». Як адзначаюць юрысты, з яго дапамогай створыцца прававая база для блакавання незалежных сайтаў.

Што рабіць, калі вы заўважылі, што сайт «Нашай Нівы» nn.by чамусьці не працуе, хоць усе астатнія веб-старонкі загружаюцца імгненна?

### Праз Новую Гвінею

Самы просты спосаб — выкарыстанне сайта-ананімайзера ці проксі-сервера. На старонку газеты трэба будзе заходзіць не наўпрост, а ў абход. Калі «Белтэлекам» заблакуе доступ на сайт для наведнікаў з Беларусі, ананімайзер спачатку злучыцца з серверам у Папуа Новай Гвінеі ці Таіці. Паколькі для гвінейцаў доступ на сайт «НН» наўрад ці будзе зачынены, вы трапіце на старонку газеты. Магчыма, сайт будзе грузіцца даўжэй, чым звычайна, але інфармацыя ўсё ж будзе атрыманая.

Дзе шукаць ананімайзеры? Дастаткова на любым сайце-пошукавіку набраць «веб-проксі» ці «веб-ананімайзер» — і з'явяцца дзясяткі варыянтаў. Напрыклад, http://kproxy.com, http://hideme.ru, http://www.spysurfing.com. Працаваць з імі лёгка — на старонцы ў пустым полі набраць nn.by і націснуць Enter на клавіятуры.

Калі нейкі з ананімайзераў не працуе — а закрываюцца яны часта, — варта пашукаць іншы.



### І я не я, і ліст не мой

З дапамогай ананімайзера можна і захаваць сваю прыватнасць. Не сакрэт, што для «прасунутых» хакераў нескладана вызначыць, з якога адраса было адпраўлена паведамленне на форум ці электронную пошту. Гэта датычыцца як інтэрнэт-адрасоў, так і фізічнага месцазнаходжання. У выпадку працы праз ананімайзер, адзіны, на каго ўдасца выйсці, — той самы няшчасны гвінейскі сервер.

Проксі-серверы падыдуць і тым, хто хоча ашчадзіць трафік — колькасць закачанай інфармацыі. Яны могуць перадаваць дадзеныя ў сціснутым выглядзе. «Распакоўка» ж будзе адбывацца непасрэдна на камп'ютары.

**Ягор Марціновіч**

# Мароз: тэхніка бяспекі

Прыйшла сапраўдная зіма. Слупок тэрмометра апускаецца ніжэй мінус дваццаці. Асаблівай увагі гэтымі днямі патрабуюць дзеці, для якіх зімовы шпацыр, гульня ў снежкі ці катанне на каньках — заўсёды радасць. Апранайце іх цёпла, але не пераўтварайце малога ў «капусту». Адна кофта з натуральнай бавоўны сагрэе лепей, чым тры кофты з сінтэтыкі.

Растлумачце дзецям, як трэба паводзіць сябе. Але памятайце, перасцярога кшталту: «Не аблізвай металічную трубу — язык прыліпне», можа выклікаць жаданне праверыць гэтую тэорыю.

Таксама групу рызыкі складаюць жанчыны. Упрыгожаная бранзалетамі, завушніцамі і пірсінгам у носе прыгажуня — ды яшчэ і без шапкі, каб не папсаваць прычоску, — мае ўсе шанцы абмарозіцца. Металы — добрыя праваднікі не толькі цяпла, але і холаду, таму зімой лепш адмовіцца ад упрыгожванняў на неабароненых частках цела.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Нельга забывацца на цёплы і зручны абутак. Лепш боты на тоўстай падэшве — у іх вы не замерзнеце, нават калі прыйдзецца паўгадзіны прастаяць у чарзе на маршрутку.

Першая прыкмета абмаражэння — збялелі нос, вушы, пальцы рук і ног. Не спяшайцеся расціраць абмарожаныя часткі цела рукамі, тканінай, спіртам, бо ад расцірання могуць ўтварыцца тромбы!

Пашкоджаныя ўчасткі скуры закрыйце сухім кампрэсам з некалькіх слаёў ваты. Не ўжывайце алкаголь і каву! Такі «ўдар» па звужаных сасудах можа прывесці да іх рэзкага расшырэння і разрыву, унутранага крывацёку і парушэння работы сэрца. Выпіце лепш цёплай гарбаты.

Можна грэць абмарожаныя рукі і ногі пад струменем вады: спачатку халаднаватай, потым цёплай. Рабіць такую працэдуру трэба хвілін 30-40. Калі праз некаторы час адчуеце боль, сверб, значыць, усё ў парадку! У вас аднаўляецца кровазварот. Але, калі боль не сціхае, — выклікайце доктара.

Калі раптам на вашым шляху сустрэнецца чалавек, які ляжыць на снезе, не спяшайцеся адвесці вочы і рабіць паспешлівыя высновы. У такую сцюжу ягонае жыццё залежыць ад вас. Выклікайце «хуткую дапамогу».

**Настасся Шамрэй**

# Як завесці аўто ў мароз

**І што рабіць, калі дзверы вашага аўтамабіля прымерзлі.**

Пры марозе, большым за 25 градусаў, знос аўто вырастае ў дзесяць разоў у параўнанні з летнім сезонам. Мо пашкадаваць легкавік ды скарыстацца грамадскім транспартам? Калі ўсё ж даводзіцца ехаць уласным аўто, вас могуць напаткаць наступныя непрыемнасці: замерз замок і дзверы, аўто не заводзіцца.

Замерзлы замок можна адчыніць нагрэтым ключом. Для гэтага спатрэбіцца запальнічка ці запалкі. Адмыкаючы, пазбягайце рэзкіх рухаў, каб не пашкодзіць механізм ці ключ не зламаць. Скарыстайцеся, калі ёсць, спецыяльнай вадкасцю для размарожвання. І, нарэшце, — гарачая вада, па якую давядзецца вярнуцца дамоў.

Прымерзлыя дзверы трэба абстукаць кулаком па перыметры і зноў паспрабаваць адчыніць. Калі не здаюцца — паспрабуйце адамкнуць багажнік. Лясніце ім добра некалькі разоў, каб у салоне ўтварылася паветраная падушка, якая дапаможа вам адчыніць дзверы. Ізноў жа — спецыяльныя вадкасці і гарачая вада з дому.

Рухавік не запускаецца. Магчыма, варта было з вечара паставіць акумулятар у цяпло. Калі ён зусім «слабы» — прыйдзецца зараджаць. Калі ён яшчэ хай сабе — трэба яго прагрэць. Уключыце запальванне, а затым дальняе святло на 10 секунд або бліжняе на 45 секунд. Затым святло выключыце і праз паўхвіліны паспрабуйце завесці аўтамабіль.

Ідэальны варыянт — наяўнасць у аўто перадпускавога падагравальніка рухавіка, ці так званага «акумулятара цяпла» — спецыяльнага тэрмаса, у які на ноч заліваецца гарачы антыфрыз.

Ну вось. Дзверы адамкнулі, аўто адчынілі, рухавік завялі. Можна ехаць. Уключаем хуткасць — машына не кранаецца з месца! Вядома: вы з вечара, прыехаўшы, паставілі яе на ручны тормаз. На гарачых тармазных калодках утварыўся кандэнсат, і яны прымерзлі да дыскаў. Дзе там наш чайнік з гарачай вадой? У вялікі мароз блакуйце машыну з дапамогай рычага пераключэння хуткасцяў.

**Падрыхтаваў Сямён Печанко**

# Як страўніку перажыць святы

**Кожная шклянка вадкасці разбаўляе страўнікавы сок і расцягвае без таго раздзьмуты жывот.**

У беларускіх традыцыях — паставіць на стол дзясятак розных страваў. Але як выжыць, з'еўшы толькі па кавалачку розных прысмакаў, а пасля яшчэ і кавалак торта наверх?

Перад застоллем мы не ямо дома і эканомім месца ў страўніку. Гэта няправільна: галодны намагаецца пакласці сабе ў талерку болей, чым можа здужаць, і праглынае ўсё імгненна. Аднак мозг атрымлівае сігнал пра сытасць толькі праз 20 хвілін пасля таго, як арганізм насычаны. Адсюль і пераяданне.

Лёгкі перакус перад гасцямі прытупляе пачуццё голаду, а вашы смакавыя рэцэптары становяцца больш успрымальныя да нюансаў гастранамічных шэдэўраў. Ідучы ў госці галодныя, мы самі сябе пазбаўляем задавальнення ад прысмакаў.

Тым, хто схільны да частых разладаў кішэчніка, можна за паўтары-дзве гадзіны да гасцей выпіць гарбаты з мятай, меліксай, сардэчнікам, валяр'янай.

Падумайце пра спалучальнасць прадуктаў і напояў. Напрыклад, мяса і рыбу адначасова ўжываць непажадана. Дый да рыбы пасуе белае віно, а да мяса чырвонае. А калі змяшаць чырвонае і белае, страўнік не парадуецца. А вось шампанскае пасуе да дэсерту. Толькі меру ведайце.

Салёная і марынаваная гароднiна — найлепшы гарнір да мяса і рыбы. Аднак памятайце: трапіўшы ў страўнік з марозівам ці крэмам, агурочкі ды памідорчыкі могуць ускладніць паслязастольнае жыццё.

А кожная дадатковая шклянка вадкасці разбаўляе страўнікавы сок і расцягвае без таго раздзьмуты страўнік. Кавалачак лімона, буйны крышталік солі ці кубік лёду пераб'юць смагу.

**Настасся Шамрэй**

**Сапраўдная беларуская кухня**

## Куцця з ячных круп

**2 шклянкі ячных круп, 6 шклянак вады, соль, цукар, алей па смаку.**

У падсолены кіпень пакласці прамытыя ячныя крупы і варыць, памешваючы, 15—20 хвілін. Калі каша загусцее, рондаль накрыць крышкай і паставіць у цёплае месца (напрыклад, накрыць коўдрай ці падушкай) на 1—1,5 гадзіны, каб упрэла.

Перад падачай на стол запраўць куццю па смаку цукрам і алеем.

## Куцця з рысу

**2 шклянкі рысу, 4 шклянкі вады, соль, цукар, алей па смаку, жменя разынак.**

У кіпень пакласці прамыты рыс і варыць за загусцення. Калі каша загусцее, дадаць жменю прамытых разынак, яшчэ раз закіпяціць. Потым рондаль накрыць крышкай і паставіць у цёплае месца на 35—40 хвілін, каб каша ўпрэла.

Перад падачай на стол запраўць куццю па смаку цукрам і алеем.

З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

## Прыватныя абвесткі

**СПАЧУВАННІ**

**Пісьменнікі Віцебшчыны** выказваюць шчырае спачуванне паэтцы Леры Сом з прычыны страты дарагога чалавека — маці.

**КНІГІ**

**Прадаю Біблію** за 5000 рублёў. Т.: (0212) 25-80-79.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

# Газетка дзеткам



АДМАРОЗІЎ ЛАПКІ

Коцік басаногі
Па сняжку гуляў,
Адмарозіў лапкі
І заплакаў: — Мяў…

Што за дзіва гэта?
Трэба бегчы ў дом:
Снег такі халодны,
А пячэ агнём…

Іван Муравейка

Больш вершаў на dzietki.org



PHOTO.BYMEDIA.NET

16 снежня, нягледзячы на мароз пад 20 градусаў, на Кастрычніцкай плошчы прайшла акцыя салідарнасці з палітвязнямі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Асілак Вячаслаў Харанека — незаменны нават на свяце мёду. Ён падняў 25-кілаграмовую штангу 26 разоў за хвіліну, седзячы на «шпагаце».




Гомельская кандытарская фабрыка «Спартак» выпусціла эратычны каляндар на 2010 год. Упрыгожыць яго пагадзіліся баскетбалісткі, што гуляюць за нацыянальную зборную краіны. На фота: Наталля Трафімава.



ВОЛЬГА ЖАРНАСЕК

Абрабаваны яшчэ адзін абменны пункт «Абсалютбанка», што месціцца ў мінскім універсаме «Цэнтральны». На шчасце, ніхто не загінуў. Злачынца адамкнуў абменнік і сейф, калі касір адышоўся. Прапалі 55 млн рублёў. Паводле следчых, зафіксаваны камерамі чалавек падобны да таго, што 10 снежня забіў касірку і абрабаваў абменнік ля ўніверсама «Аўтазаводскі».



PROSTO-FREE.LIVEJOURNAL.COM

На галоўны алтар Фарнага касцёла ў Гродне перад Калядамі вярнуўся апостал Сымон. Унікальны разьблёны алтар быў знішчаны падчас пажару 2006 года. Фігуры святых аднаўляе па фотаздымках разьбяр з Воранава Казімір Місюра.




«Такім ён быў. Бывай, 2009-ы!»

## Вітанні



**Любую мамачку, дачку і жонку Алену Цэван віншуем з Днём народзінаў.** Выдатнага здароўя, шчасця, здзяйснення ўсіх мараў! Бацькі, дзеці, муж і зяць.

* * *

**Любімага мужа і тату Дзяніса віншуем з Днём нараджэння!** Зычым здароўя і шчасця. Наста і Міласлава.

## АНЕКДОТЫ

* * *

— А чаго генерал маўчыць?

— Думае. У нас у войску так: калі генерал маўчыць, значыць, або думае, або — партрэт.

* * *

Феміда — гэта такая цётка, якая штосьці важыць, штосьці сячэ, але ні халеры не бачыць.

* * *

Банкамат выдаў паперку з надпісам: «Недастаткова сродкаў». Гэта ў мяне ці ў банка?

* * *

Цаглінка за цаглінкай — будуе сваё шчасце вартаўнік цагельні.

* * *

У ягонай жонкі былі толькі два станы: або яна сыходзіла ў сябе, або яна выходзіла з сябе.

* * *

Муж — жонцы:

— Слухай, што за рыба ў нас у юшцы плавае?

— Табе што, мая юшка не падабаецца?!

— Мне не падабаецца, што рыба яе есць.

## НН 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Слуцк.** Праз тутэйшы банк за гэты год прыслалі розныя людзі сваім родным 140 тысячаў рублёў грошай, зробленых у Амерыцы.

**«НН». №51—52. 1909**

**Антынароднае рашэнне.** Улады прынялі пастанову забараніць ужываць у назвах партыяў ці грамадскіх аб'яднанняў словы «народны» ды «нацыянальны». Праблемы цяпер паўстаюць перад партыяй «Народная грамада» ды Беларускім Народным Фронтам.

**«НН». №32. 1999**

**Шаноўныя чытачы!**

Наступны нумар «НН» выйдзе 6 студзеня. Вясёлых Вам Калядаў і шчаслівага Новага года!

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6200. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 22.12.2009.
Замова № 6996.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.

ISSN 1819-1614

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12